Ба 54893

# ЗА ДАМБАЮ



Б/а 54893

СЯРГЕЙ ЗНАЁМЫ

Ба 54893

СЯРГЕЙ ЗНАЁМЫ

391.72

O-A.D.U.K.
Инв 270078
Г.Л.Б. Ср.-на

9

# ЗА ДАМБАЮ

*КНІГА НАРЫСАЎ*

Б 54893
2

Бел. аддзел
Д. Б. Л.

БССР
Дзяржаўная бібліятэка
імені
Леніна

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1931

ЗЬМЕСТ

За дамбаю . . . . . . . . .
Дні і людзі . . . . . . . . .
Плытагоны . . . . . . . . .
У трамваі . . . . . . . . .
Каця Астаповіч . . . . . . . .

25. 04. 2009

Б В-70

Заказ № 551. 5.000 экз. (3 3/4 арк). Галоўлітбел № 26

Друкарня імя Сталіна.

# З А   Д А М Б А Ю

## I

Быў стары абымшалы бор. Даўгэзныя сосны цягнуліся да неба. А некалькі ніжэй елкі раскідвалі сваё касмацьцё. Грудзі-ж зямлі здаваліся дзівоснаю васьмірноваю беларускаю коўдрай. Зялёна-жоўты мох упрыгожваў улоньні бору. Дзе-ні-дзе валялася сухое гальлё. Рознае птаства знаходзіла тут сабе сельбішча. Бесьперапынна зьвінела жоўна. Дзяцел чыбучыў сухое верхаўё дрэў, а на тоўстай даўгэзнай сасьне адпачываў каршун пасьля ночнай стомы. Азіраючыся навакол, сарока цікавалася сесьці ў сваё гняздо.

У поўдзень у гэтым бары панавала ціш. Стома ад цяплыні і сьпякоты сонца абымала і бор, і ўсіх яго жыхароў. Толькі часта здаралася, што мядзьведзь парушаў сьвяточнае гультайства бору. З густой пушчы, у якую пераходзіў бор на захадзе, пераваліваючыся з нагі на ногу, выходзіў мядзьведзь на лясную

прагаліну, каб пагрэцца на сонцы, вось тады і пачынаўся тарарам. Усё жывое бору падымалася на ногі. Налятала вараньнё, сіўкі-варонкі, дразды. Уся гэта ўзрушаная зграя птаства з шалёным крыкам-вэрхалам зьвісала над месцам, дзе адпачываў рыжы. Рознымі галасамі перагукваўся бор, нават у таёмных нетрах пушчы, час ад часу, то дзікая кошка, то хітрая лісіца падавалі свае галасы. Але так цягнулася нядоўга. Зьвяга надакучвала рыжаму і ён, ня скончыўшы свайго адпачываньня, зьвяртаўся зноў у пушчу. Тады ціш абымала бор.

Вечарамі і раніцой бор жыў дзівосна радасным жыцьцём. Рознымі галасамі поўнілася яго глухамань. І затое страшэннай была для птаства ноч. Ноччу жыцьцё на валаску. Як толькі сьцішыцца гоман дня, птаства ўсядзецца на гнёздах, так і зьяўляюцца ў лесе начныя жыхары—пагроза птаства—дзікія каты і совы. Блішчаць іх вочы сьветлякамі ў начнай цемені. Гора табе сарока, гора! Не схавала цябе калматая елка, зірк савы ўбачыў твае гняздо. Вось пусьцілася сава ў лёт. Скрыдламі не махае, а куляй рынулася на гняздо.

— Кр-р-р, кр-р-р-р!—і зноў маўклівая ціша цёмнага бору. Ды з высі ляціць на дол пер‘е.

Неўздалёк пачуўся трэск гальля, потым крык, нібы-та малога дзізяці. Хтосьці чалавечым жалобным голасам прасіў паратунку,

— Яў-яў-яў-у...—То дзікая кошка ўсьсела на зайца. Яна яшчэ ў дзень прыкмеціла, дзе ён адпачываў. А цяпер, у ночным змроку, пакашачаму ціха падкралася і, ускочыўшы зайцу на хрыбёт, клыкамі сьціснула яго за шыю. Бедны касабокі, як ён шыбка ні бегаў, як ні нёсься між зялёнай папараці, не дапамагло. Гадаўка-суседка, з вачыма-агенчыкамі перамагла...

Так было на захадзе, дзе стары бор перасякала Бярэзіна. Шпарка струменілі воды, з замілаваньнем глядзелі ў іх стромкія белыя бярозкі. А на тым баку Бярозы — Барысаў. З кляштарамі, царквой і касьцёлам, з вузкімі і гразкімі вуліцамі, з пахіліўшыміся драўлянымі хатамі, з рынкам шырокім, на якім водарыць нясьціханая, цягуча-нудная песьня старцаў. Гэта нядаўна мінулае Барысава.

## II

Жнівень. Апошнія чырвонаармейскія часьці пакідалі Барысаў. Ня сьцішалася яшчэ рэха ружэйных стрэлаў, як па ўсім горадзе рассы-

паліся польскія салдаты. Яны бегалі на хатах і закавулках. Шукалі бальшавікоў. Але гэта было між іншым, асноўная-ж задача—пагромы яўрэйскіх кватэр, захоп каштоўных прылад і маемасьці.

На Маскоўскай, Полацкай і Лепельскай вуліцах з хлебам ды сольлю спатыкалі „сваіх збавіцеляў ад чырвонай заразы“ прыхільнікі польскага бізуна. Але на іх вялікае зьдзіўленьне польскія жаўнеры, адпіхнуўшы ў бок хлеб ды соль, пад пагрозай вінтовак узяліся здымаць лепшую вопратку ды абутак...

За базарнай плошчай стаяў фанерны помнік Карлу Марксу. Убачыўшы яго, польскія салдаты кінуліся зрываць фанеру. Хтосьці прынёс банку газы. Помнік аблілі, пыхнула сярнічка і полымя зьніштожыла фанерныя сьценкі помніка. Трэба было бачыць, якое задавальненьне расплылося па твары хорунжых. Бачна ім здалося, што зьнішчаючы помнік Маркса, яны зьніштажаюць марксыцкія ідэі сярод працоўных гораду...

Хорунжыя памыліліся. Ідэі марксызму жылі на ўскраінах, у мізэрных рабочых хатках. Ідэі марксызму жылі сумесна з комуністычнай партыяй і комсамолам у падпольлі.

Каля чатырох дзён гаспадарылі ў горадзе палякі. Рабункі панавалі над горадам. Салдаты перакінуліся на згвалчэньне жанчын. Рэзалі тупымі нажамі бароды старым яўрэям. Рабілі, што ім жадалася.

Ноч была неспакойная. Затрэскалі кулямёты, загудзелі знарады, горад дрыжэў. Раніцой чырвоныя байцы выбілі на правы бераг Бярэзіны, у Нова-Барысаў, панскіх салдат. Узьюшаныя паны не маглі супакоіцца, яны адкрылі агонь па горадзе. Адзін за другім узрываліся над Барысавам запальвальныя знарады. Загараліся дамы, руйнаваліся. Агонь зьнішчаў жыльлё працоўнага мірнага насельніцтва. За некалькі хвілін Полацкая вуліца была схожа на магільнік. Дамы і крамы зруйнаваны. Горад абымала дымовая хмара.

З сілай волата запальвальны знарад прабіў страху фабрыкі „Вікторыя". Узьняўся пажар. Вінтовачная і кулямётная страляніна павялічвалася. Вораг пачаў абстрэльваць горад шрапнэльлю. Рваліся знарады, шчабяталі кулі, фабрыка гарэла. Рабочыя, чырвонаармейцы, кожную хвіліну рызыкуючы жыцьцём, кінуліся ў агонь ратаваць фабрыку, машыны, варштаты. Гадзіны напружанай працы. Пот выступіў на

тварах людзей. Частку фабрыкі выратавалі. Вораг убачыў сваю слабасьць перад такой вялізарнай сілай арміі і насельніцтва. Як ні стараліся паны, усё-ж яны засталіся бітымі. Хутка надышоў час расплаты. Пад напорам чырвоных войск польскія салдаты былі выбіты з Нова-Барысава.

— Даёш Варшаву! — разьнярслося па ўсёй краіне. Польская армія намазывала пяткі, каб лягчэй было ўцякаць.

## III

Балота. Дрыгва. Балотныя вокны цьмяна глядзелі ў хмарамі пакрытае неба. Быў 1920 г. Чырвоная армія пачала напіраць. Па кустох на балоце адступалі палякі. Час ад часу кляліся на балоце варожыя знарады. Шлёпнецца ў балота знарад і зашыецца бяз выбуху. Кулі секлі вярхі кустоў. З жалем хілялася маладое падсечанае гальлё. Уцякаючы, паны абстрэльвалі горад. Пачалі з ускраін. Порхаўка. Тут папяровая фабрыка, дрэваапрацоўчы завод. Вось празьвінеў знарад над балотам. На дарозе ўзьняўся пыл, а потым выбух. Каменьне бруку высока ўзьнялося ўгору. Са звонам пасыпалася шкло з акон. Хвіліна. Ціш, ціхутка

каўзанула між стрэх, а потым зноў кулямётнае сакатаньне, вінтовачныя стрэлы і гудзеньне знарадаў напоўнілі паветра.

Захісталася па-веснавому цёплая раніца.

— Дз-дз-дз-дз. І раптам, разьдзіраючы вушы, выбух. Пахіліліся муры дрэваапрацоўчага заводу, труба задрыжэла, а потым усё разам з гулам, грукатам, трэскам, з лямантам рушылася. Паляцелі цэглы і чырвоныя языкі полымя пачалі лізаць заводзкія сьцены. Сапраўды, гэта быў страшэнны пажар, за некалькі хвілін зьнішчыўшы дрэваапрацоўчы завод. Некалькі хвілін і на месцы волата-муру засталося вугальлё і попел ды голыя цагляныя сьцены. Завод сьцёрты з твару зямлі. А вораг не сунімаецца. Свой жудасны сьмяротны агонь ён накіроўвае на другія ўскраіны. Гудзеньне знарадаў і кулямётныя стрэлы заглушылі плач насельніцтва і страшэнныя стогны падаючых ад знарадаў фабрычна-заводзкіх корпусаў.

Але, дзесьці за горадам, каля Студзёнкі, Вялікай Ухалоды, у брод, праз шпарка бягучыя воды Бярозы, перапраўляліся чырвоныя, краліся ў тыл варожых войск. І вось спуджаныя зьяўленьням у тылу чырвоных, белапанскія салдаты, ня чакаючы загаду хорунжых, рушы-

Дзяржаўная бібліятэка ... імя Леніна

ліся наўцёкі. Але і гэтую апошнюю хвіліну яны ня цураліся курыцы, добрай рэчы, або папаўшайся жанчыны. Лютым зьверам кідаліся белапаны на кабет. На вуліцы, па хатах, па некалькі чалавек на адну, гвалтавалі яны жанчын.

Толькі гэта быў апошні рэйс панскіх жаўнэраў.

З вялікаю радасьцю спатканыя рабочымі і працоўным насельніцтвам, Нова-Барысаў занялі чырвонаармейцы. Мірнае, працоўнае жыцьцё пачалося ў горадзе. Толькі часам аднекуль здалёку даносіліся гарматныя стрэлы. Пачуеш гэты стрэл і мароз абыме цела. Страшэнна жудасным здавалася новае спатканьне з панамі. Нават тая нязначная частка насельніцтва, якая да прыходу паноў была за іх, цяпер вожыкам зрабілася і шчыра прасіла „пана Езуса“ аб незьвяртаньні „абаронцаў шляхецтва“.

## IV

На руінах мінуўшчыны быў закладзены новы, наш, мацней граніту і сталі, соцыялістычны падмурак вялікай будоўлі. Паны ганебна пакінулі горад, і вось тады працоўныя

масы—рабочыя гораду і Нова-Барысава, з падвойнаю энэргіяй узяліся за адбудову разбураных фабрык і заводаў. Прайшло некалькі дзён пасьля ўходу палякаў і фабрыка „Чырвоная Бярэзіна“ першай падала свой голас. Гудок узрушыў напуджаную ціш. Працоўнае жыцьцё пачалося, „Бярэзіну“ падтрымалі паравозныя гудкі адбудоўваючагася транспорту. Узарваны панамі чыгўначны мост адбудаваны. Пачаў множыцца рух цягнікоў...

Між жалезным і драўляным мастамі нацянькі з гораду ў Нова-Барысаў расьцягнулася дамба. Абапал сенажаць курганамі разьляглася. Мінуўшы ўскраінныя хаты гораду, вы ўзьбягаеце на дамбу і чароўна дзівосны малюнак буйнага будаўніцтва разгортваецца перад вачыма. Нова-Барысаў, як на далоні. Над магутнымі фабрычна-заводзкімі корпусамі ўецца чорны дым, а ў паветры зьвініць нясупынная песьня, гімн пераможнай працы, гукі радасьці, песьня новая, аб новых днёх і пераможных дасягненьнях, песьня гудкоў.

Тут за дамбаю, у Нова-Барысаве, зусім паінакшаму струменіць жыцьцё, ноч і дзень бесьперапынна, горад фабрык і заводаў жыве пасвойму, па-асабістаму. Цяжка, а часам і немаг-

чыма прыкмеціць, калі пачынае жыць горад. Цяжка таму, што тут амаль ніколі ня спыняецца рух рабочага жыцьця—говар мотораў і варштатаў—пераклічка заводзкіх гудкоў.

Ці былі вы калі ў Барысаве да Кастрычніка?

## V

Ці былі вы ў дваццатых гадох? Не? Ня былі? Тады вам цяжка будзе зразумець і ўсвярыняць тыя зьмены, якія адбыліся ў горадзе за прайшоўшыя савецкія гады. А зьмены гэтыя грунтоўныя і вялікія.

У дваццатым, пакінуўшы панурыя хаткі гораду, вуліцы гразкія, завалены розным хламам, вы перабіраецеся праз стары драўляны мост у Нова-Барысаў. І тут, каля вогнішч фабрык і заводаў з жальбою стаялі гарбуніхаты рабочых. Куды ні кінь зірк, усюды жудасны малюнак—сьляды панскіх войск. І дваццаты мінае паноў няма. Ціха і рашуча пачынаецца адбудоўчы пэрыод. Цяжка, галадна, сьцюдзена, але праца ідзе. Барысаўскія рабочыя, прасякнутыя верою і жаданьнем, адбудоўваюць разбураныя прадпрыемствы. Сьледам за „Чырвонаю Бярэзінаю“ завод імя Домбаля падае свой голас, папяровая фабрыка „Праф-

інтэрн", завод „Комінтэрн" і іншыя. Рабочая напружанасьць перамагла.

Там, дзе пяць год таму назад гойдаліся маладыя вішні ды яблыні, дзе шушукалі лісты клёну, там—у цэнтры Нова-Барысава, узрасьлі высокія муры пабудаванай ім па апошнім слове тэхнікі новай запалкавай фабрыкі —„Пролетарская перамога".

Ціха. Зусім ціха. Толькі час ад часу вырвецца глухі гук ад удару малатка, загудзе варштат, маланкай мільгане электрычнасьць ды ледзь-ледзь закруціцца мотор і зноў цішыня абыме гэтыя прыгожыя, шматкаляровыя муры. Толькі ветрык—нязваны госьць, шугане, зьмяце сваім буйным хвастом за стрэх сьнег і зноў ціш. А ўнізе, каля самых ног будынкаў, шпарка струменяць воды, бягуць кудысь у шырокія прасторы, сьведкі шматлікіх боек, сьведкі змаганьня і перамог—крышталёвыя воды Бярозы. Усьціхамірыцца вецер-гуляка, супакояцца воды Бярозы і звонкая песьня, песьня працы льлецца з фабрыкі. Пры электрычным асьвятленьні ідзе праца—вялікі ўздым творчай энэргіі.

Зойдзем у гэтыя муры, паслухаем гэтых людзей, паглядзім на сталёвыя волаты-машыны...

Роўненька, адна ў адну стаяць зьёмальныя і афарбовачныя машыны.

Чок-чок, чок-чок, чок-чок—гутарaць яны між сабой, выплёўваючы гатовыя карабкі запалак.

Лясь-лясь, лясь-лясь—люба вылясквае дзесятковая машына, што зроблена на нашым, савецкім Рыбінскім мэталюргічным заводзе.

Стук-стук, стук-стук,—выстукваюць малаткі рабочых, што забіваюць вялікія скрыні з карабкамі гатовых запалак.

А далей, у нетрах машыннага гулу, ляску і стуку, у звоне жалеза, у гутарцы дзівосна-рытмічнай патанулі людзі. Патанулі сьцены, патанулі нават волаты-аўтоматы. Не, аўтоматы ня хочуць падацца. Вось яны, нібы танкі, пазадзіралі ўгару свае пярэднія часткі, але ніяк ня могуць узабрацца. Вось і застылі так, падняўшы галовы ўгару.

— Дз-з-зы, дз-з-зы—дзярэ вушы скрыгітаньне бясконцых істужак, што круцяцца вакол волатаў-аўтоматаў.

У аўтомат паступае гатовая саломка. Тут яна набіваецца, тут робяцца галоўкі запалак, тут сушацца і разам з рамамі людзі адносяць іх потым у зьёмальны цэх. І ўсё гэта робіцца

так проста і так шпарка! Глядзіш—і вачом ня верыш. Нібыта слухаеш казку, нібыта сьніш. Ня верыцца! А верыць трэба, бо гэта ня казка, бо гэта ня сон, а гэта вялікая справа, дзіцё вялікага Кастрычніка, роднае і ўласнае дзіцё працоўных мас. Каштоўнае яно. Дужа каштоўнае яно, гэта дзіцё, для кожнага рабочага старой фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна“, бо будавалася новая фабрыка за лік прыбыткаў ад старой.

Надыходзіла колумоўная кампанія, а чырвонабярэзінцы не чакалі надбаўкі. Ня было з чаго падбаўляць. Трэ' было будаваць новую фабрыку.

— Дзяржава наша бедная. Грошай няма. Трэба самім як-небудзь абыходзіцца,—так гаварылі на сходзе рабочым—і рабочыя згаджаліся. Таму і вырасла так хутка любае дзіцё і дарагое.

Далей, за аўтаматамі стаяць сушыльныя шафы, іх усяго дзьве. Тут сушыцца набракшая саломка, тут яна шліфуецца. Паступае яна сюды ад варштатаў, што рубяць саламяную шчапу.

Ціха шапоча з вострым нажом белы, добра выпараны асінавы чурак. Ледзь рухаецца вал.

Кранулiся, закруцiлiся махавiчкi i шасьцяронкi.

Чок-чок, чок-чок,—запяялi дапаможныя невялiчкiя колцы. Павольна з мялiцы шэль-машыны плыве шырокая—здаецца бясконцая, белая стужка — запалкавая стужка. Паглядзеце на яе,—на гэтую бялёсую гладкую стужку. Параўнайце яе з гэтай-жа стужкай фабрыкi „Чырвоная Бярэзiна“. І нават, калi вы нiчога не разумееце ў вытворчасьцi запалак, калi вы, нават, першы раз трапiлi на запалкавую фабрыку, дык i то заўважыце розьнiцу. Гiльзавая стужка новай фабрыкi шмат танейшая—i вядома, эканомнейшая. Нарэзы для згiнаньня шмат глыбей. Уся стужка роўненькая, няма тут нi танейшых, нi таўсьцейшых месц. Гладкая, роўная, прывабная, як i сама маладая дзяўчына, што сьцелiць гэтую стужку ў „ляг“—дашчаную скрынку.

Калi „ляг“ засьцелены паўнютка, iстужкi адносяць да сячкарнага варштату. Тут iх сякуць на-патрэбны памер i па конвэеры адпраўляюць да скрыначных машын.

А якiя яны дзiвосныя; стаяць у два роўненькiх радочкi, нiбыта адна аднэй любуюцца. Глянеш на iх, радасьць агорне. Такiя яны прывабныя i любыя. Вачэй ня можна адарваць.

Стаяў-бы вось так, ды цешыўся. А яны сакочуць як куры напярэдадні добрага надвор'я. Выкідаюць на коньвэерную сетку карабкі, а апошнія, пакрысе рухаючыся, адвозяць карабкі—унутраныя і надворныя—у сушыльныя шафы. У шафах карабкі сушацца нядоўга, праз якіх дзьве-тры мінуты яны ўжо вэнтылятарам падаюцца да машын, а адтуль ідуць да здымальных варштатаў.

Так робяцца запалкі на новай фабрыцы „Пролетарская перамога“.

— А ведаеце—неяк ня думалася, — кажуць мне старыя рабочыя Бяляцкі і Сьвідрыцкі,— неяк ня думалася, што мы сапраўды пабудуем гэтую фабрыку...

— Я на гэтай фабрыцы ўсёроўна як у Ленінградзе,—губляюся неяк, ніяк не магу прывычаіцца,—кажа вылучэнка—загадчыца здымальнага цэху, Наста Патаповіч.

— Ну, гэта яшчэ ня ўсё, вы старыя мо' і не дачакаецеся, а мы—моладзь і ня гэта яшчэ ўбачым. Цікавае жыцьцё, нябачаныя дасягненьні толькі цяпер пачынаюцца. Мы яшчэ не такой пролетарскай перамогі дасягнем на фронце соцыялістычнага будаўніцтва нашай краіны,— шчыра, поўны моцы, веры і маладосьці

ГПБ Ср. Аз.

сказаў комсамолец Цымкоўскі, вылучэнец на пасаду загадчыка змазачнага цэху.

А поплеч з новай фабрыкай высока ўзьняліся колёны будынку новай электрычнай станцыі імя т. Леніна. Тут ня тое, што на „Пролетарскай Перамозе“, дзе адзін чалавек між машын, шафаў і аўтоматаў застаецца няпрыкметным, тут прысутнасьць аднаго чалавека адразу дае сябе адчуваць, праўда, ня ўсюды. Скажам, у кацельным аддзяленьні чалавек здаецца молекулай супроць волата-катла „Борзіг“. А вось у турбогенэратарным аддзяленьні, інакш. Тут ня сіпяць вужакі—пара, а льлецца мілая монотонная песьня турбогенэратара. Пераліваецца электрычнае сьвятло на 13 белых мармуровых разьмеркавацельных дошках.

Электрычная станцыя яшчэ ня скончана. Пакуль што ўстаноўлены адзін турбогенэратар і адзін кацёл. Але электрастанцыя ўжо асьвятляе горад, старую фабрыку, круціць дзьве зьмены Баргаркомбінату і новую фабрыку „Пролетарская перамога“. Хутка яна дасьць сваё сьвятло і на завод імя Домбаля. А ўвесну электрычную энэргію атрымаюць усе прадпрыемствы гораду, атрымаюць яе сялянскія хаты вакольных вёсак.

Як быццам ззаду ўсёй фабрыкі стаяць яшчэ няскончаныя душы і шафы для спэцвопраткі. Рабочы, пасьля скачэньня працы, зможа памыцца, скінуць з сябе той пыл, які набярэцца за час працы. А далей, у пачатку будынку, чысьценькая, выбеленая, добра абсталяваная, новая сталоўка. На сталах ляжаць газэты, часопісы. Рабочыя, што прыйшлі на зьмену, чакаюць тут. Люба, так люба, нават ісьці адгэтуль ня хочацца...

... А праз вакно бачна, як чорны дым з трубы электрычнай станцыі сьцелецца па дахах старой фабрыкі, а потым спаўзае на зямлю. Рытмічна гутораць моторы, выразна стукаюць малаточкі ды гудуць правады звонка і прыгожа.

Тут, за дамбаю, дзе Бярэзіна робіць круты заварот, нібыта жадаючы ўрэзацца ў лес, тут пачынаюцца вясковыя палеткі. А поплеч з фабрыкай „Профінтэрн“ на высокіх рыштаваньнях хутка ідзе праца па адбудаваньні другога на Беларусі дрэваапрацоўчага комбінату. З нейкай таямніча-грознай сілай растуць з дня ў дзень каменныя муры. А ў некалькі кроках ад корпусу дрыжаць да болю сьмешныя сьцены старога замухрышкі завода —„Ком-

бібліятэка імені Леніна

інтэрн". Хутка-хутка зойдзе ён са сцэны дзейнасьці, хутка падменіць яго волат-комбінат з двухтысячнай масай рабочых.

За „Комінтэрнам" і аж да самай прыстані разьляглася бярвеньнямі і грудамі дроў ветка. Зімой і ўлетку нясупынна ідзе тут праца. Зімой у вагоны і на пляцформы нагружаюць і адпраўляюць лес і дровы за межы і ва ўсе канцы СССР. Улетку сюды падганяюць па Бярозе плыты. І тады па-інакшаму, па-плытагоннаму жыве ветка. Яна на нейкі час робіцца гульліва-вясёлай, нібыта старая лапцюжная вёска перад вялікім сьвятам.

* * *

Шмат чуў, шмат бачыў, шмат перажыў Барысаў. Вялікія войны князёў полацкіх з кіеўскімі, паходы Мсьціслава на крывічоў, францускую вайну, помнікам аб якой засталіся вядомыя „батарэі", сярод якіх стаіць першая раённая бальніца...

... Я знаёміўся з матэрыяламі аб заснаваньні Барысава. І што-ж? „На думку адных гісторыкаў, Барысаў быў заснаваны ў 1102 г. князем полацкім Барысам Усеславічам, а на думку іншых—адбудаваны Яраславам І, вялікім кня-

зем Кіеўскім у 1032 г.“ Хто праў з гісторыкаў—цяжка ўстанавіць, дый ня варта. Але-ж тое, што Барысаў шмат перанёс здрад і перамог, тое, што горад, спалены панскімі жаўнерамі, здратаваны панскімі войскамі, пасьля Кастрычніцкіх дзён зрабіўся моцным пролетарскім цэнтрам, горадам фабрык і заводаў—гэта бясспрэчна.

# *Д н і і л ю д з і*

Розныя бываюць дні, розныя бываюць людзі. Людзі мяняюць дні, дні мяняюць людзей. Глядзіш і ня верыцца. Ведаеш чалавека, пачнеш прыглядацца бліжэй, выразьней робіцца аблічча, толькі чалавек, той ня той. Бо дні паклалі свой адбітак, жыцьцё ўнесла свае карэктывы.

## I

Вялізарныя корпусы Гомсельмашу. Увойдзе чалавек і нязначным зробіцца. Невялічкім пад зьвіслым спляценьнем жалезных крохваў, ня прыкмеціш, а калі за сілосарэзку стане, дзень прастаіць—ня ўбачыш. І прастойваюць людзі, ня ўсе, але шмат. У зборачным цэху закурваць пачнуць, слоўцам перакінуцца, глядзіш — гадзінка на вецер. У ліцейнай на дзяўчат хлопцы заглядзяцца, шпільку адколюць па іх адрасу. У выніку гадзінка ў расход.

А майстры, завы цэхаў, брыгадзіры? Яны:

— У нас людзі розныя, большая частка ўпяршыню на заводзе. Бяз прывычкі, што з імі зробіш.

І вядома—нічога ня зробяць.

Курыць рабочы гадзіну:

— Няхай!

У краму да гудку пойдзе:

— Хай сабе!

На работу зусім не зьявіцца:

— Больш клопату ня было-б.

Таму і растуць прагулы, павялічваюцца прастоі, Рабочая сіла не скарыстоўваецца. Ходзяць рабочыя ў майстра Рыжыкава гадзіну па цэху, ходзяць другую. Дзень бывае прахо-дзіць—няма работы. І майстра няма. Іншаму рабочаму што—дома кароўка, паўвалокі зямлі, сын хлебароб, конік. Заплацяць па-сярэдняму—хопіць. Абы дзень прайшоў. А Рыжыкаў бегае. Рабочыя сядзяць, пакурваюць, сьмяюцца. Жартуюць.

Дырэктар заводу тав. Амбражунас ценьню ходзіць, хмараю супіцца.

— Прагулы растуць, заўком нічога ня робіць. Дошкі чорныя з чырвонымі зрабілі—пустуюць. Сьпісы прагульшчыкаў ня вывешва-

юцца. І чорт яго ведае, што робіць гэты заўкомам,—кажа Амбражунас.

Старшыня заўкому т. Кучаравенка шчарнеў ад „матаў“ і кпін рабочых, ад штодзеннага сьвербу.

— Дапамогі няма, сьпісаў прагульшчыкаў няма. У табельшчыкаў прасіў — не даюць, у майстраў—дык дзе там. З загадчыкамі цэхаў гаварыў — мала карысьці. Да Амбражунаса зьвяртаўся—не дапамагло. Хоць ты самому станавіся каля варот, ды сьпісы завадзі, за яўкай рабочых сачы.

Крыўдна Кучаравенку. І як ня крыўдзіцца? Паставілі табельнікам нейкую старэчу-недарэчу. Рукі трасуцца, сам дрыжыць. Ня бачыць нічога, ат стаіць, ды ў палучку грошы дарэмна атрымлівае.

Загудзіць гудок, рабочыя сьпяшаюцца. У праходзе шмат рабочых. Не спраўляецца табельнік „маркі“ атрымліваць. Шапку на дапамогу, сыпяцца маркі ў шапку. Сем. Праца пачалася. Дзесяць хвілін прайшло, а рабочыя ўсё ідуць. Ня пусьціць—працаваць ня будзе каму, варштаты будуць стаяць. Значыцца, трэба пусьціць, узяўшы на ўлік спазьніўшыхся. Спазьніўшыяся сьпяшаць. Іх маркі ня трэба зьмешваць з мар-

камі тых, што сваячасова прыйшлі на працу і табельнік у шапцы, на ранейшыя маркі зьверху паперку сьцеле, кладуцца маркі на паперку.

Невялічкі прыземкаваты хлопец, спазьніўшыся, кінуў маркі ў шапку. Спыніўся, зірнуў на гадзіньнік—палова восьмае.

— Чаго добрага, вымову дадуць.

Падышоў да табельніка:

— Табельнік, няўжо я спазьніўся,—ды за паперку торг? Маркі ў шапцы зьмяшаліся. Спазьненьні пісаць няма на каго.

— Выбачайце! Мне паперка для закурваньня патрэбна.—Усьміхнуўся і памалу пайшоў у цэх. І толькі калі ён схаваўся, табельнік прамовіў:

— Ах, сабачы сын! І заяві на такога ў кантору, чаго добрага, з завулку цэглінай па галаве зьезьдзіць!

Часта пазьніўся на работу і Гуркін. Прагульваў яшчэ часьцей. І хіба толькі ён адзін? Шмат было такіх сярод рабочых Гомсельмашу. Шмат і цяпер ёсьць.

І вось аднаго разу.

З воч каціліся сьлёзы. Буйныя, адна адну даганяючы. Невялічкая дзяўчынка, абшчэплі-ваючы нагу бацькі, усхліпваючы плакала.

— Татачка, любенькі, ня трэба, ня ідзі! Няхай сабе яны ідуць. У іх ёсьць маці, а ў мяне няма... Татачка, ты мне лекцыі пакажаш, а потым на завод пойдзеш. Татачка, ня ідзі, я адна ў хаце баюся.

Гуркін спыніўся ў нерашучасьці. Спачатку, думаў „таўхануць дачку, ды ісьці з сябрамі выпіць. Праца ня воўк, у лес ня ўцячэ. Учора не працаваў, заўчора не працаваў... Звоняць? Няхай. Былі-б рукі, праца знойдзецца. З Сельмашу прагоняць, завод Ланцуцкага, „Пролетары" ёсьць. Там месца знойдзецца... Ды вот прыліпла дачка да нагі, плача, просіць. Дзіцё. Сьлёзы коцяцца. Маці няма, пашкадзаць няма каму. Не пашкадуе, ня прытуліць бацька—Гуркін.—Ніхто не пашкадуе. Што каму да таго, што дачка Гуркіна плача.

Гуркін анямеў. Швырнуць дачку, пайсьці. Заўчора пайшоў, учора пайшоў. Заўчора піў, учора піў. Сёньня пахмяляцца думаў... Так прадзед рабіў, дзед за ім, бацька сьледам. Сам Гуркін за імі крочыць. Значыцца дачка Сахвелька пойдзе за ім. Піць будзе, курыць будзе, вусны фарбаваць будзе, на вуліцу пойдзе... І гэта дачка Гуркіна, Мікіты, рабочага, які ўласнаю рукою бандытаў душыў, якому

восьгэтую мазалістую руку сам Фрунзе паціснуў“.

— Не!

Нахіліўся Гуркін, дачку на рукі ўзяў, сеў з ёю за стол. Сахвелька кніжкі дастала, бацька бутэльку квасу. Выпіў шклянку, вусы выцер, дачцы лекцыі пачаў паказваць.

У калідоры Гуркіну спаткаў настаўнік.

— Ну, як, Гуркіна, што чуваць з бацькам? Ходзіць ён на завод?

— Ходзіць і ня п‘е. Дамоў заўсёды зьяўляецца. Гурток стаў наведваць. На нараду ходзіць. Нават лекцыі мне вучыць дапамагае.

— Вось гэта добра. Значыцца, ты зрабіла так, як я табе казаў. Папрасіла яго.

— Але. Нават паплакала крыху.

— І перамагла?

— Але.

— Вось гэта добра, што ты перамагла бацьку. Во, каб так, ды ўсе вучні рабілі, шмат-бы мы дапамаглі тады нашай вытворчасьці.

## II

Чорны пыл соўма лез у нос. Дыхаць рабілася цяжэй. А людзі, седзячы над чорнаю зямлёю, працавалі. Там, у кутку Розэнкран з

Любянікавай рыхтавалі формы да адліўкі. А тут, пад наглядам майстра Каровіна, Станкоў, Валхавец, Бяданаў „лёд“ устанаўлялі ў гатовыя формы. Ішла падрыхтоўка да адліўкі ў ліцейным цэху Гомсельмашу. На твары людзей і руках—хваляваньне. І як не хвалявацца. Набралі ў цэх нічога ня ведаючых людзей, далі пясок і модэлі:

— Працуйце!

Цэх новы, людзі новыя, інструмантаў не хапае. Апок не стае.

— Працуйце!

— А як працаваць? За што ўзяцца? Дзевяноста чалавек у цэху, а кваліфікаваных толькі дзевяць, астатныя—чорнарабочыя, дзеці рабочых, падлеткі, упяршыню на заводзе. Адліўкі ў вочы ніколі ня бачылі, за працу-ж ўзяліся.

— Нажмем,—сказалі фармоўшчыкі.

— Нажмем,—далучыліся шышальніцы.

І вось насторожыўся цэх. Рухі людзей зрабіліся ціхімі, у кожнага на твары спуд і радасьць. Радасьць ад таго, што формы гатовы да адліўкі. Спуд перад вынікамі. Авось, ды першы блін комам. Тады...

Тры гадзіны. Званок. Рабочы дзень скончаны. Але-ж з цэху ніхто ня ідзе. Другі званок.

Заліўшчыкі чарпакі нарыхтавалі. Ваганшчык зірнуў у „вочка“ вагранкі. З памосьціка саскочыў. Зямлю ў латачку разгроб. Акуляры на вочы насунуў. Піхнуў зямлю жалезным кійком. І першая чыгунная плойма, раскідаючы вогненныя іскры, пакацілася па латачку ў чарпалку.

Пробная адліўка скончылася позна. Але да канца былі ўсе—чорнарабочыя, фармоўшчыкі, шышальніцы, інжынэры, майстры. Глядзіш на гэтых людзей і бачыш, як праблескам расплаўленага чыгуну легла на іх радасьць перамогі.

— Добрая адліўка,—гаварыў назаўтра майстра Жарскі.—Здорава мы, хлопцы, папрацавалі!

— На тое і ўдарнікі,—адказаў Афінгейн, рабочы 47 год, цяпер адзін з лепшых вучняў на фармоўшчыка.

## III

„Со знамени складки,
играя огнем,
свисали,
подобные утренним тучам.

И буквы,
которые были
на нем,
гласили:
„тому, кто окажется лучшим".

Вось за гэты, высеўшы ў заўкоме, чырвоны пераходны сьцяг і пачалася бойка ў цэхах заводу.

Першымі вышлі на лінію агню брыгады зборачнага цэху. Але-ж яны доўга не пратрымаліся. Іх перамог вораг—недахопы і дапушчаны прарыў у прамфінпляне. Брыгадзіры зборачнага цэху апусьцілі галовы—ім было сорамна. А ў гэты час зарухалася комсамолія, занятая на выпуску ланцугоў для сілосарэзак.

Чаму? Здарыўся выпадак. Комсамолец Робэрман прагуляў два дні. Закацілі яму вымову. Да ўсяго-ж гэтага хтосьці з заводзкіх хлапцоў нахлоп, ды паштоўку да каханай Робэрмана накатаў.

*„Сорамна, тав. Р., з прагульшчыкам гуляць. Ты-ж комсамолка. Да чаго дапускаешся? Загульваецца хлопец. На работу позьніцца. На днях зусім не зьявіўся. Ганьба і сорам!"*

Прачытала Р., сапраўды сорамна зрабілася. Вечара пачала чакаць. Ведала—прыдзе Робэрман. А калі прыжмурыў дзень вочы і цемень заслала вуліцу, вышла Р. на спатканьне.

Робэрман прышоў. Толькі сьцюдзёнай была іх сустрэча. Зморшыкі нездаволенасьні зьбіраліся на шчаках Р.

— Нездаволена? Чым?

Маўчыць. Потым вусны расчыніла. У руку паштоўку сунула:

— На! Я з прагульшчыкам ня гуляю! Навошта мне цярпець за цябе сорам?—Завярнулася і пайшла.

Прачытаў.

— Так. Што-ж. Паглядзімо.

На работу прышоў. Крыўдна. Думаў пашукаць, хто пісаў паштоўку, ды ў морду зьездзіць разы са два. Але рашыў—ня варта. „Усё-ж я комсамолец. Трэба інакш дзейнічаць... А як?“...

Дзень прайшоў. Ціха. Другі—ціха. На трэці сярод клёпальшчыкаў ланцугоў заварушыліся, загаманілі.

— Робэрман штосьці мудрue.

— Комуну згуртоўвае.

— Дужа нешта горача ўзяўся. Як-бы да занападу недастукаўся.

— Сарвецца хлопец,—гаварыў сакратар цэхпарт'ячэйкі тав. Сімховіч.

Пачуў Робэрман.

— Бяз вас сарвуся, з вамі справу дасягн

— Мы што. У добрай справе дапаможам.

— Гэта мне і патрэбна.

З адным пагутарыў Робэрман, з другі Трэці сам падышоў. Чацьверты далучыўс Так у чэрвені згуртавалася комуна. Дзеся чалавек паўланцуга на брата рабілі ў дзен У ліпені стала шаснаццаць чалавек. Па паўта ланцуга выганялі. У жніўні—восемнаццаць ч лавек. Ланцуг і тры чвэрткі выганялі, а ў в расьні дваццаць чалавек пачалі па два ланцу кожны выганяць.

Аб комуне загаварылі. Комунары зьнішчы прагулы, прастоі, спазьненьні. Яны з яшчэ бол шым імпэтам узяліся за працу, абвясьціўш вайну недахопам, вайну за чырвоны пераходн сьцяг. І яны перамаглі. Сьцяг застаўся комун

# ...ЛЫТАГОНЫ

I

Паўлік разьвітаўся з апошнымі крыгамі. Вер... хавіны дрэў паслалі ім, уплываючым у сінь— ...расторы, апошняе „бывай“. Нахіліліся голыя ...озы, каб разьвітацца... Ня стрымаў і Зьмітрок. Зьняў ён шапку, акруціў яе на пальцы рукі, ...ы кінуў здагонку крыгам.

— Да пабачэньня!

Пачулі хлопцы голас Зьмітрака. Як круціў ...шапку ўбачылі. Сьмехам заліліся.

— Бач, стары, а і ён у вясьне толк ведае..,

Вясна.

Сапраўды, прышла маладая, радасная вясна. Сонца пановаму пачало ліць на дол сваё поў...нае радасьці і цяпла сьвятло. Птушкі зашчабя...талі. Бадзёрым шумам шолахам загаманіў стары бор. Вецер зрабіўся сьвежым, цёплым, шустрым ... ласкавым.

Вясна. Ластаўкі снуюць над вадой. Бусел ...а лузе дыбае. Дзікія качкі шныруць у кустох.

Вясна. Дыхацца лягчэй зрабілася. Вальней-шым зрабіўся чалавек. Сілу адчуў, моц. Сябе адчуў.

— Ну, хлопцы, заўтра за працу прымаемся— плыты вязаць, а сёньня адпачнем,—прамовіў Зьмітрок, прыцэльваючыся сесьці каля пацярых хлопцаў.

Сеў. Сабраў вакол сабе некалькіх сухіх галінак, палажыў на іх шапку—вышэй пад галаву будзе, ды лёг. Лёг і як анямеў. Заснуў. Зьвялі і хлопцы вока. Сонца-ж плыло па сініх водах Паліка, а з-за лесу вецер нёс вечар...

II

Палік—цудоўная мясціна. Казачнае возера. Мора, а ня возера. Кругом лес. Бор стары, пушча. І здаецца, каб ня было гэтага бору, ня ўбачыць-бы чалавечаму воку берагоў Паліка.

Такое яно вялікае. Сіня-чорныя воды гойдаюцца ціха. А дрэвы нязьлічанай колькасьці адлюстроўваюцца ў неабсяжна-цудоўным люстэрку.

Ледзь, ледзь прыкметна, як у двух кілёметрах ад берагу хвалюецца вада. Выставіўшы чорную галаву, плыве бабёр. Цяжка яму. Ён папаў на рэчышча Бярэзіны. Гэта яна—Бярэзіна

перасякае Палік, нясучы свае воды ў Дняпро. Бурліць вада. Цяжка бабру, але ён змагаецца. Вось пераплыў ён рэчышча. Стаў. Кінуў вакол зірок. Нікога няма. Зноў крануўся. Ды прост на вогнішча, Скмеціў цяпло. Нырнуў. Толькі круг разышоўся па вадзяной гладзі...

— О, бабёр, хітрая жывёліна! Хоць і шмат іх у Паліку, а ўбачыць ня лёгка. Баіцца чалавека. Трус бабёр, хлопцы. Вялікі трус і плакса,—кажа Зьмітрок.—У мінулым годзе мы толькі было адплылі ад берагу, а віхор як хопе нас, ды к берагу. Як ні трымаліся—не дапамагло.

Прыпёр.

Стаім.

Аж бачым—між берагам і плытамі сядзіць бабёр. Склаў лапкі, ды плача, як чалавек, сьлёзы так і коцяцца, і коцяцца адна за аднэй, аж шкада стала. Узялі мы яго ды шлёп у ваду. І ня стала, а праз некалькі хвілін вынырнуў і прастаяў на вадзе пакуль мы не адплылі... ня інакш гнязло блізка было...

Палік. О, тут не адны бабры. Тут у сініх водах ёсьць надзвычайна вялікія самы, шчукі, ляшчы. Тут шмат рознае рыбы.

Улетку ў цёплае ціхае надвор'е перад заходам сонца, або ў поўдзень, калі над вадой снуюць ластаўкі і кулікі, узыходзяць з дна возера самы і кідаюцца з вады, каб схапіць птушку. У такія разы ніводзін рыбак не адважыцца выехаць на чоўне на возера.

А ў пушчы, якая акаляе возера з усіх бакоў, паўнюсенька рознага зьвяр'я. Тут табе і воўк, і дзікі кабан, лісіцы, козы і каты дзікія, а часам, нават лось шмыгане праз паляну.

Палік—гэта ціхая дзяржава—бацькаўшчына зьвяр'я. Тут спакойна жыве цецярук, заяц разгульвае. Дзятлы стукочуць дзюбамі...

Большасьць жыхароў гэтага бору - пушчы пораху стрэльбы паляўнічага ня нюхалі, стрэлу нават ня чулі. Так і жывуць на волі ў цішы і супакоі пад абаронай і вартай лесу.

III

І калі, абмыўшыся ў водах Паліка, выкацілася сонца, шэсьць чалавек узялося за працу. Скацілі ў ваду два бервяны. Паклалі на іх дзьве жардзіны. Прыбілі. Каб мацней было, дротам перавязалі і пачалі качаць на гэту аснову плыта бярвеньні. Клалі іх поплеч, пры-

мацоўвалі. Наклалі адвін, потым другі рад. Праз гадзіны дзьве плыт быў гатоў.

— Пачатак ёсьць,—прамовіў Зьмітрок. Адпачнем, хлопцы. Шкода ўсё-ж, што паўлітра няма, а то і замачылі-б...

— А хіба табе яшчэ ня мокра,—пажартаваў Гваздоўскі.—Я дык поўныя боты начэрпаў вады.

Закурылі. Пасядзелі. Ды зноў узяліся за працу.

Бор стары зашумеў. Прабягаючы ветрык закружыўся па сіняй роўнядзі Паліка. Праплыло бервяно. Гваздоўскі хацеў злавіць. Цюкнуў у канец бервяна багром. Слаба. Другі раз хацеў стукнуць—не дастаў. Уцякло.

Усю апошнюю частку дня хлопцы вязалі плыты. Роўна праз тры дні плыты былі гатовы. Ціхім раньнім золкам плытагоны пакінулі Палік. Здаецца пахіліўся ў разьвітаньні стары бор, а дзесь на беразе прапяяў жаўра разьвітальную песьню.

— Цёпла, хлопцы, будзе, жаўры запяялі...

Плылі тыдзень. А на другі, у яснае сонечнае раньне, прыляцелі да плытагонаў знаёмыя песьні—музыка гудкоў барысаўскіх фабрык і заводаў. Пад поўдзень міналі масты. Прайшлі

добра. Плыты не парвала. Па Бярэзіне снавалі чоўны. А з рэчкі Сха на Бярозу выплывалі новыя плыты. Гучная песьня разносілася з вуснаў плытагонаў. Любая, вясёлая, шумнарадасная плытагонная вясна пачалася. Зьмітрок параіў хлопцам лепш сачыць за сваімі плытамі.

— Бачце, яны дрэнны заварот зрабілі пры выхадзе са Схі, здаецца заломіць, а там глядзі і парве. Трымайцеся правай... Хвост хай ідзе каля самага берагу... Гваздоўскі, вазьмі арала[1]), ды ў выпадку чаго кідайся на бераг... стрымлівай плыты.

Прыгожа агінаючы ўзгорак, струменюць воды Бярэзіны. Насустрач плытам ішоў параход.

Гваздоўскі кінуўся на бераг.

— Стрымлівай, стрымлівай, а то парве—крычаў Зьмітрок.

Ад параходу ў бакі разыходзіліся хвалі. З вялікай сілай і пагрозай каціліся яны да берагоў, выкідаючы за зялёную рунь шапкамі белую пену.

...Потым, калі параход прайшоў і Бярэзіна супакоілася, зноў паплылі плыты. Толькі цяпер

---

1) Прычал.

Зьмітрок заўважыў, што на рацэ былі не адны яны, а шмат людзей з баграмі—братоў плытагонаў.

— Эй, прычалівайся,—гойкнуў хтосьці з берагу.—Пад жалезным мастом заламала Янку.

Глянуўшы ўперад, Зьмітрок убачыў, што каля быкоў жалезнага маста зьбіліся платы. То заламала плыт Янкі Багуцкага, які добра выпіўшы не заўважыў, што блізка мост. Перадок стукнуўся ў бык і плыт заламала, а потым—парвала.

— Эй, Гваздоўскі, прычал...

Плыт зарыпеў, бо Гваздоўскі, не чакаючы, калі падасьць голас Зьмітрок, пачаў прычаліваццa.

Па беразе бегаў дзесятнік і дужа хваляваўся.

— Вось, ліха іх матары. Перасалілі хлопцы. Задужа хлебанулі, ну і вядома недасачылі, пад мастом заламала—плыты парвала... Не, браткі, пры такой працы мы програмы па лесасплаву ня выканаем. А програма вялікая. Трыццаць процантаў усяго беларускага сплаву прыпадае на Барысаўшчыну. Больш як тры тысячы чалавек працуе. А пачнуць усе ў бутэльку глядзець—кепска будзе... Зьмітрок малайчына,

першым пайшоў на Палік—і пайшоў добра. Як кажуць, у добры час... Ай, яй, яй, чуць не забыўся, што ў кантору трэба бегчы. Сёньня тры новых партыі адыходзяць на Палік і трэба-ж было мне забыцца.

Дзесятнік хуткімі крокамі пабег да канторы. Шлях пад мост расчыніўся. Гучнай гутаркай адчаліваліся ад берагаў плытагоны. Трэба было сьпяшацца, бо заводы чакаюць сыравіны.

# У ТРАМВАІ

Сідар Трахімаў—ударнік, сьпяшаўся на завод. Ледзь праціснуўшыся праз натоўп, ён ускочыў у трамвай. Там было цесна. У перадзе Трахімава стаяла дзяўчына. Жмурачы вачыма, яна пастрыкала пальцамі.

— Машыністка,—падумаў Сідар. Ззаду, мармочачы штосьці сабе пад нос, у нейкім старамодным выцертым паліто і гэткім-жа капялюшы тоўкся невялічкі з брытым тварам сярэдніх год мужчына.

— Не напірайце, грамадзяне, павальней!— гаварыў мужчына, старояючыся, як-бы ня прыткнуцца да вопраткі Трахімава.

Ззаду напіралі. Пасажыраў прыбаўлялася. Мужчына нэрваваў. Яго непакоіла брудная замусолена вопратка Сідара. Ён баяўся, як-бы ня прыткнуцца да Трахімава, да яго чорнай вопраткі.

— Крышку лагадней, таварыш, бо сваёй вопраткай мяне выпацкаеш!

Трахімаў паглядзеў на суседа, а той усё фыркаў.

— Кажу лагодней, во, бачыце, ваша пячатка,— і сусед Сідара паказаў на рукаў паліто, дзе была нейкая чорная пляміна. Ён выняў з кішэні беленькую насатачку і пачаў выціраць гэтую пляміну. Незнарок ззаду таўханулі. Сусед носам дзеўбануўся Трахімаву ў плячо

— Фу, якая брыдота! Вось выпэцкаўся ўвесь... Падайцеся крышку ўперад.

Трахімаў маўчаў. Трамвай бег з гары. У вагоне так націснулі, што нэрвовы чалавек вымушаны быў прыхіліцца да Трахімава.

— Ой, што-ж гэта такое... Грамадзяне, таварышы, ды гэта-ж ня ў краме ЦРК.

Трахімаў зноў зірнуў на суседа, паглядзелі і іншыя...

А калі трамвай ішоў пад гару, пярэднія пасажыры падаліся крышку назад. Пахіліўся і Трахімаў. Ды неяк локцем рукі пацёрся аб вопратку непакойлівага суседа, а той і ўзьеўся. Запорскаў, замахаў рукамі і чым далей, усё мацней падаваў свой голас.

— І як вам ня сорамна такому брудному апірацца і церціся каля майго паліто. Што хочаце,

каб і я зрабіўся такім-жа брудным. Не, выбачайце, я ня хочу, прынцыпова ня хочу!

Пасажыры пракалолі неўгамоннага чалавека вачыма. Але-ж гэта не дапамагло. Ён усё рыпаўся:

— Гэта немагчыма. Гэта недапушчальна. Што-ж гэта ў трамваі ня можна ў чыстай вопратцы ехаць? А потым, які смурод, ой, хоць ты нос заторквай. І навошта пускаюць такіх брудных, замусоленых у трамвай. Во, ды каб гадкоў з 15 назад, паляцеў-бы ты, мой суседзе, з гэтага вагона, сваіх ня прыпомнячы!

Пры гэтых словах Трахімаў павярнуўся. Ёмка ўзяў гаварлівага суседа за каўнер, той згорбіўся ў камячок. А пасажыры, нібы-та разумеючы ў чым справа, расступіліся. Трамвай ішоў ціха. Трахімаў падвёў незадаволенага чалавека да выхаду і, падняўшы яго ў абедзьвюх руках, ёмка ссадзіў з вагона.

— Там не абробішся!

У вагоне прабегла ўсьмешка. Праз акно было відаць, як нядаўні пасажыр з гогалеўскім носам, стоячы, пагражаў кійком вагону. Трахімаў усьміхнуўся, а дзяўчына, аб якой ён думаў, што яна машыністка, нейкім асабліва ласкавым, блізкім поглядам, зірнула яму ў вочы.

„Вось гэта, дык хлопец!“ падумала яна.

# К А Ц Я  А С Т А П О В І Ч

I

Віктар Корзун даўно ўзяў на прыкмет Кацю Астаповіч. Часта, падкочваючы этажэркі, кідаў ён на Кацю зірк. Толькі Каця чамусьці гэтага не заўважала. А можа і заўважвала? Хто яе ведае.

Аднаго разу Віктар стаяў каля прыёмшчыка скрынак. Да гудку заставалася хвілін дваццаць. У цэху такая стаяла духата, што хоць ты бялізну скідай з цела і то не дапаможа. А тут яшчэ на ліха вэнтылятар сапсаваўся. Дзяўчатыпакавальніцы нібыта з вады павылазілі, аж цякло з іх.

Ішоў прыём марак. Работніцы падбягалі да стала загадчыка цэху і той запісваў. Каця працавала на заднім стале. Калі крыху справілася, сабрала маркі і хуценька пабегла. Віктар працяў яе зіркам. За некалькі крокаў ад стала ў Каці зваліўся грабянёк. Яна на бягу падняла яго і толькі ступіла крокі два, як раптам спад-

ніца хлюп далоў. Каця ад такой неспадзяванасьці асалавела, як укопанай стала. А Віктар, о, з якой ён прагнасьцю глядзеў на белыя сьцегны, да якіх прыліпла мокрая ад поту сарочка. Яго аж скаланула. Каця схамянулася. Яна падабрала спадніцу, адшукала шпільку і, зрабіўшы ўсё, як мае быць, падбегла да стала. Здала маркі. Віктар пайшоў у сушыльню. Трэ' было яшчэ падкаціць пару этажэрак. Узяўся за адну, папхнуў і ня мог каціць. Як ніколі, у ваччу стаяла Каціна постаць.

З гэтага дня Віктар стаў часьцей падыходзіць да Астаповіч. Пачаў прымаць у яе без прагляду „сор“, на сходах ячэйкі садзіўся разам, а калі часам бывалі выбары якіх-небудзь камісій—першы высоўваў кандыдатуру:

— Астаповіч, пішы Астаповіч, добрая баба,— крычаў Корзун.

У пачатку Каці не спадабаўся Віктар. Невялічкі, з кірпатым носам, рот аж да вушэй, і ўсё чагосьці ўсьміхаецца, нібыта патаеннасьць якую адкрыў. Але з бегам часу Каця прызвычаілася. Чаму ня так, чалавек да яду прывыкае. Калі на фабрыцы пайшлі чуткі, што Віктара ў загадчыкі другой зьмены вылучаюць, дык Каця зусім раздабрэла. І аднаго разу пасьля сходу

ячэйкі, дзе абгаварвалася вылучэньне Корзуна, ідучы з Віктарам дамоў, моцна пацалавала яго.

Усё пайшло сваім парадкам. Віктар і Каця шмат ліпнёвых вечароў правялі разам.

— Любая,—гаварыў Віктар, тулячы да сябе Кацю.—Якая ты харошая.—І яго вусны ўпіваліся ў яе шчокі, потым у бровы. Цалаваўся Віктар з засосам. Як дарвецца да вуснаў Каці, дык не цалуе, а ссе іх, і ўсё шчыльней, ды шчыльней туле да сябе Кацю. А яна і не бароніцца. „Хай, такі ён любы і дарагі, такі добры і сэрцамі натурай... І ў ячэйцы яго любяць“,—думала Каця. І сапраўды, Корзун у ячэйцы карыстаўся аўторытэтам. І калі паўстала пытаньне, каго абраць экономпрацаўнікам,—усе комсамольцы ў адзін голас заявілі:

— Корзуна!

Абралі. Пачаў Віктар працаваць. Перш за ўсё ён дабіўся запаўненьня процанту броні на фабрыцы. Па-другое, дабіўся таго, што ў часе астаноўкі фабрыкі на рамонт, 8 чалавек моладзі паслалі ў дом адпачынку. Потым правёў конкурс на лепшага вытворчага рабочага.

— Малайчына хлапец!—гаварылі ў партячэйцы.—Добры працаўнік будзе.

Вось чаму, калі дырэктар фабрыкі спытаўся ў сакратара парт'ячэйкі т. Хамко, каго вылучыць у загадчыкі паказвальнага цэху другой зьмены, дык той, доўга ня думаючы, адказаў:

— На маю думку т. Корзун адна з найбольш падыходзячых кандыдатур. Хлопец кругом пяць. Добры працаўнік. Рабочы стаж сем год. Стары комсамолец. Кандыдат партыі. Член профсаюзу і г. д., як кажуць.

— Ты, Хамко, не жартуй.

— Я не жартую. Давай пагутарым на бюро. На маю думку, усур'ёз, гэта адна з лепшых кандыдатур.

— Давай пагутарым,—згадзіўся дырэктар.

Так і вылучылі Віктара. Пасьля бюро на агульным сходзе пагутарылі. Потым гэта пытаньне перанесьлі на вытворчую нараду. Усюды прайшоў. Усюды гаварылі, што хлапец добры, сумленны, ведае фабрыку і працу.

Віктар пачаў працаваць на новай пасадзе. Сустракацца з Кацяй даводзілася рэдка. Новая праца адымала надзвычай шмат часу. А Кацю гэта пачало дужа непакоіць. І каб пазбыцца суму, яна пакрыху стала ўцягвацца ў ячэйкавую работу. Больш яе цікавіла політасьветная галіна. Яшчэ раней, нябожчыца матка часта

гаварыла „будзеш ты ў мяне, дачушка, настаўніцай“. Але-ж ня збыліся яе думкі. Скончыла Каця толькі шэсьць груп сямігодкі. У ячэйцы яна была амаль аднэй з самых больш-менш пісьменных. Даручылі Каці кіраваць гуртком па падрыхтоўцы ў ШРМ. Спадабалася Каці гэта работа. У газэты ды кніжкі часьцей пачала заглядваць.

Пад восень, у сьвятошны вечар, сядзеў Віктар з Каця́й у гарадзкім садзе. Так было люба і радасна. Каця каламаціла на Віктаравай галаве валасы. А ён, прытуліўшыся да грудзей, слухаў, як б‘ецца яе сэрца. Яго рука няпрыкметна спаўзла на Каціна сьцягно. Унутры Віктара штосьці сьціснулася, а потым як-бы адарвалася, скаланула Віктара. Ён мацней пачаў прыціскаць да сябе Кацю, тужачыся паваліць яе на траву. Каця моцна сьціснула Віктара. А потым, раптам, адштурхнула, ускочыла і, як-бы варам лінула на Корзуна:

— Ой, які-ж ты, Віця, палкі... Ня думала я... Пойдзем, любы, годзе. Заўтра рана ўставаць трэба!—Яна падала Віктару руку, а той, нібыта стаміўшыся, ледзь устаў.

Увосень здарылася тое, чаго Корзун ніяк не чакаў. Трэст рабіў перакід (сарака чалавек)

з іхнай фабрыкі на запалкавую фабрыку ў горад В. У лік сарака, як адзіночка, папала і Астаповіч.

Плакала Каця, калі давялося разлучыцца з фабрыкай, з горадам, са знаёмымі. Плакала ад таго, што даводзілася пакідаць Віктара, самага блізкага, самага роднага, самага любага чалавека. Так прывыкла да Віктара Каця. Чаму, яна не разумела, толькі штосьці цягнула, штосьці ўнутранае штурхала яе да Віктара, да яго блізкасьці, да яго ласкі, пацалункаў. Шкода было фабрыкі, на якой забіла яе бацьку, былога мэханіка. Шкода ўсяго, з чым звыклася з малых дзён, што было блізкім, добра знаёмым. „Паеду... адна, сярод чужых, незнаёмых людзей, у чужым горадзе, што я буду рабіць? Дзе дзенуся?“ І сэрца так зашчаміла, а буйныя сьлёзы закапалі з воч.

Зьбіраючы свае манаткі, Каця наторкнулася на фотографічную картку маткі. Маладая, прыгожая жанчына, з пасмачкай чорных валос, зьвісшых на лоб, глядзела Каці ў вочы. Каця ўспомніла. Чатыры гады таму назад яна сабралася ісьці ў школу. Раптам адчыніліся дзьверы і ў хату ўбег старшы сьлесар Шыманскі. Ён цяжка дыхаў, а па шчаках каціліся

сьлёзы. Скрозь слёзы, ледзь кратаючы языком, ён сказаў:

— Зьмітраўна!... Ва-ш-ш-аа-га Сідара забіла!

І тады гэта самая прыгожая жанчына нічога не адказала, а як стаяла ля стала, так зразу і села ў „вэнскае“. З яго больш і ня ўстала. Мёртвую зьнялі. Ой, колькі-ж паплакала Каця. Колькі сьлёз праліла. Цяжка было. Але Каця перажыла. Ёй далі працу на фабрыцы. Зьвязалася з добрымі дзяўчатамі. Праз паўгода ў комсамол прынялі...

Да прыходу цягніка засталося паўгадзіны. І Каця, адкінуўшы ў бок успаміны, пачала хутчэй зьбірацца... Вечарэла, калі яна пакідала хату... На вагзале былі ўсе ў зборы. З комсамольцаў, папаўшых у „саракоўку“, было толькі двое—Каця, ды тэхсакратар Пісклігін.

За тры хвіліны да адходу цягніка на вагзал прыбег Корзун.

— Ледзь вырваўся са зьмены. Кінуў цэх, дый прышоў!

— Кепска, Віця, зрабіў!—моцна ашчапіўшы, са сьлёзамі на вачох, пацалавала яго. Цягнік крануўся. Віктар саскочыў з падножкі.

— Пішы!—кінуў ён Каці.

— Абавязкова, любенькі,—адказала яна.

## II

У Янкі Шарко бацька быў лясьнікам. Каб сказаць чалавек дрэнны, дык не. Ат, так сабе. З сялянамі не сварыўся. І перад панам Рыгаровічам ня выслужваўся. Жыў, як шмат хто з сялян. Ціхі быў чалавек. Жыў ціха і памёр ціха. Зьеў аднаго разу гарачых аладак, забалеў жывот і Нічыпар Шарко „богу душу аддаў". Заўдавела Тадора—жонка Нічыпара. Бяз бацькі застаўся і Янка. Толькі і было надзеі ў Тадоры, што на Янку:

— Вырасьце і да старасьці мяне пракорміць.

Янка спадзяваўся на матку.

— Раз матка ёсьць—значыцца ўсё добра будзе.

Так-сяк і жылі. Перабіваліся. Пан наняў другога лясьніка. Тадора з сынам у горад пераехала. Тадора ваду насіла. Янка памёлы з мётламі вязаў. Так і жылі. Спрабаваў Янка ў школу хадзіць. Дзьве зімы правучыўся, а на трэцяю маці і кажа:

— Навука не для цябе, Яначка. Лепш-бы табе на завод.

Так і здарылася. У 1916 г. Янку прынялі на запалкавую фабрыку. Ціхі быў Янка, па бацьку ўдаўся.

У 1922 г. Янка ўступіў у комсамол. Неяк проста ўсё гэта адбылося. Хлопцы сказалі ўступай, Янка, бо ты-ж ня горшы за іншых. Ну, Янка і ўступіў. Калі-ж Кацю Астаповіч знаёмілі з Янкам, то ён ужо лічыўся актывістым і надзвычай добрым хлопцам.

— Дзівак хлапец,—сказала Каця пасьля таго, як Янка схаваўся за фабрычнымі варотамі.

— Не памыліся,—адказаў сакратар комсамольскага колектыву, Андрэй Клышко.—Ён у нас хлапец—во! Член Акругкамолу, на ўсесаюзным зьезьдзе быў.

Каця слухала, толькі нічога не адказала. Ёй было не да Шарко. Сум нейкі не даваў спакою. Вось ужо два месяцы жыве і працуе яна ў новым горадзе, на новым месцы. У ячэйку ходзіць. Толькі адчувае, што чагосьці не стае. Комсамольцы, асабліва комсамолкі, ня любяць таго, што Каця ходзіць бяз хусткі, і ў паліто, а не ў скуранай куртцы.

— Бачце,—гаварыла Тырца Соскінд,—яна ня хоча насіць той вопраткі, у якой нашы бацькі Смольны бралі.

— Гм,—падумаў, стоячы непадалёк, Юзік Клочка. І потым уголас дадаў:

— Нашы-та бацькі, дарагая Тырца, Смольны

бралі, а вашы-та на рынку з людзей скуру дралі!

Каця ведала, што трэба штосьці зрабіць для таго, каб схіліць крыху да сябе комсамольцаў, бліжэй пазнаёміцца з імі. А зрабіць можна было толькі праз ячэйку, паказаўшы, што і яна не адшчапенка, а комсамолка. Трэба было паказаць сябе на рабоце. Трэ' было атрымаць нагрузку.

Неяк у нядзелю, спаткала Каця на вуліцы Клышко. Ён паціснуў руку. Пачалі гутарыць. Каця маўчала. Гаварыў Андрэй. Гаварыў аб тым, што дужа цяжка працаваць, што ў ячэйцы ўпала дысцыпліна, што парт'ячэйка слаба кіруе, не дапамагае ў практычнай рабоце. Каці не хацелася гэтага слухаць, бо становішча ячэйкі яна добра ведала.

Ведала, што работа пастаўлена дрэнна, што комсамольцы не даюць сябе адчуваць на вытворчасьці, толькі слухаць пра гэта не хацелася.

— Слухай, таварыш Клышко. Як-бы гэта мне нагрузку якую. Бо швэндаюся я ўвесь час бяз ніякай работы, а папрацаваць хочацца.

— Фу, чаго добрага, а нагрузкі хоць дзьве, хоць тры, хоць пяць. Хочаш у колектыве, хо-

чаш у цэхячэйцы. Абы шыя, а пятля знойдзецца.

Клышко перакінуўся яшчэ некалькімі словамі, паабяцаўшы нагрузіць, разьвітаўся, і пабег у райком...

Неяк у пятніцу, у абедзенны перапынак, Алеся Казлоўская, тэхнічны сакратар цэхавай ячэйкі, зьбірала грошы на вечар. Вырашылі дзяўчаты зрабіць вечар у хаце Зосі Купрэевай. Падышла Алеся да Каці:

— Астаповіч, запішыся на вечар.

— А чаму не. Колькі ўзнос?

— Палціна.

— Добра.

Амаль кожную суботу моладзь фабрыкі, у тым ліку і комсамольцы, зьбіраліся невялічкімі гурткамі, і „каб разьвесяліць душу“, ладзілі вечары пад гармошку, з півам, а хто пабагацей, з кішэняй, дык і з віном. Часта на гэтых вечарох узьнікалі бойкі. Плёткі цягнуліся розныя, як павуціньне, і ўсё-ж, ня гледзячы на гэта, моладзь „весялілася“, бо другога месца ня было, і ніхто ня цікавіўся ёю. Ат, як ёсьць, хай так і будзе.

На вечар Каця прыйшла з Клышко. Ён спаткаў яе пры вароце на Набережную.

— Ці не ў адну дарогу,—спытаў Андрэй.

— Ня ведаю... А ты куды?

— Да Зосі. На вечар запрасілі.

— Тады ў адну дарогу,—сказала Каця, прыбаўляючы крок.

На вечары было шэсьць дзяўчат—комсамолак і шэсьць комсамольцаў. Каці адразу кінулася ў вочы тое, што ўсе былі папарна. Юзік Клочка і Тырца Соскіна—пара. Юзік „страляў“ за Тырцай. Алеся Казлоўская і Ромка Дразлоў—гарманісты,—пара. Зося Купрэева і Цімка Гаршчок—набівальнік, нічога сабе хлопец—пара. Рузя Закрэўская і Ясь Гулько—пара. Хведзька Казыра і Полька Хацкевіч—пара.

— А я,—падумала Каця,—а, Клышко, сакратар, мільганула ў галаве.

На стале расстаўлялі пасудак: талеркі з кілбасой і пячэньнем. Ромка адчыняў бутэлькі з півам. Селі. Кожны з хлапцоў прымайстраваўся да сваёй „зазнобы“. А Клышко, як і трэба было чакаць, прысеў да Каці.

— Ну, пачынай, сакратар,—гойкнуў Ромка да Клышко, Андрэй узяў бутэльку, наліў поўную шклянку піва Каці, потым сабе. Усе зрабілі тое-ж.

— Таварышы!—прамовіў Андрэй,—за лепшую таварыскасьць сярод нашага актыву і за высоўваньне новага актыву, прадстаўніком якога зьяўляецца Астаповіч—вып'ем!—Шклянкі стукнуліся. Клышко зірнуў на Кацю. Яна сядзела нярухома.

— Астаповіч, за тваё здароўе!—Каця ўзялася за шклянку, і стукнуўшыся з Клышко, асушыла яе.

— Во, гэта маладзец баба!—кінуў Ромка.— Гэта па-нашаму.

Каця даўно ня піла піва і таму цяпер яно здалося ёй не асабліва горкім. Па целе неяк шпарчэй заструменіла кроў. Разьвязаліся ў дзяўчат языкі. Хлопцы павесялелі. Ромка палез за гармонікам. Клышко, убачыўшы ружовасьць шчок Каці, пасунуўся да яе бліжэй. Каця гэта заўважыла. Пачалі наліваць па другой шклянцы.

— Юзік, ты ўжо пачынаеш!

— Што, Тырца,—як-бы не разумеючы ў чым справа, спытаўся Юзік, і шчыльней прытуліўся да Тырцы. У гэты-ж самы час нага Клышко прыхілілася да нагі Каці.

„Усёроўна ніхто ня ўбачыць“, — падумала Каця.

Пaглядзела на астатніх. Усе гутарылі, сьмяяліся.

Рузя схіліла галаву да Ясі. Цімка, абшчэпліваючы Зосю, штосьці шаптаў ён на вуха. Каця спусьціла далоў руку, нібыта жадаючы паправіць панчоху. А як толькі пачала падымаць руку, Клышко злавіў яе за палец. Потым ахапіў далонь і моцна пацісну́ў. Каця пагледзела яму ў вочы. У гэты час Ромка заіграў. Сьціснутае паветра прарэзаў гармонік. Пачаліся скокі. Позна цягнуўся гэты вечар „спайкі" актыву. Клышко праводзіў Кацю. Гутарыць абодвум не хацелася. Клышко адчуваў нейкую асалоду, ён моцна трымаў Кацю пад „крэндзель" і туліў яе да сябе. Кацю абдало садзей. Хацелася спаць. На разьвітаньне Андрэй зьнянацку ашчапіў Кацю і замест вуснаў пацалаваў яе ў бараду. Каця вырвалася. І не прамовіўшы ні слова, схавалася за дзьвярыма калідора.

— „Нічога, котка, нідзе дзенешся. Не такіх, як ты, і то ўламалі. А цябе і няма чаго". І Клышко, ідучы дамоў, успомніў, як ён прыляпётваў за Рывай Гельфанд, пакуль аднаго разу ў яе дома не дасягнуў свайго. „Рыва плакала. І што-ж. Хай! На тое яна і дзяўчына",—

гаварыў потым хлопцам Андрэй. Прыехала аднекуль Моцька Маліноўская. Такая пекная, а косы як кужал, да паясьніцы. Спадабалася. Пакахаў. А потым у парку... Клышко помніць і зараз тое месца. Помніць, як Моцька плакала і скрозь сьлёзы гаварыла: „ня трэба, любы, ня трэба! Мне-ж толькі 17 год... Любы... мілы... Ня трэба!“ Не дапамагло. Цяжэй было з Танькай Грын. Ніяк не ўдавалася ўламаць. І пацалуеш, і памілуеш, прытуліш, а як толькі... Гатова вочы выдраць. І то неяк аднык не. Гатова вочы выдраць. І то неяк аднаго разу ў яе дома, да таго ўзьюшыў дзяўчыну Андрэй, што ня вытрымала, заплакала. Сама аддалася.

Усё гэта засталося ззаду, як і пяцігадовы комсамольскі стаж, Чон і паход на бандытаў. На ўсё забыўся Клышко. „Сумна зрабілася ў комсамоле, ня было добрых дзяўчат. Ня было каму запаліць сэрца“,—казаў часта Андрэй. Сакратарстваваў-жа ён так сабе, абы адбыць чаргу, дачакацца перавыбараў, а там—комсамол бацька. Спрабаваў Андрэй чытаць—спаць хочацца. Напісаў некалькі допісаў у газэту—не зьмясьцілі. Пасылалі Андрэя вучыцца. Перш думаў паехаць, а потым:

— Да ну яе к чорту гэту вучобу! Хопіць

і без мяне вучоных, а мне, пакуль будзе комсамол,—месца будзе.

Прыезд Астаповіч паставіў Андрэя на ногі. Мэта была. Сэрца „загарэлася“. Клышко вучыць ня трэба. У адносінах да дзяўчат—ён зух. І чамусьці дзяўчаты да яго ліпнуць, хоць пасьля і плачуць.

III

Тырца Соскінд у 1924 г. скончыла сямігодку. У 1925 годзе піонэратрад перадаў яе ў комсамол. Бацькі Тырцы былі гандлярамі. Дужа нахацелася Тырцы вучыцца. А як паступіць ў навучальныя ўстановы—ня ведала. Будзеш жыць разам з бацькамі,—ня прымуць, бо як не кажы а дачка гандляра. Вось і вырашыла прабрацца на прадпрыемства, год—другі папрацаваць, зрабіцца членам комсамолу, набыць вытворчы стаж і тады гайда ў Маскву, ці Ленінград!

Прыехала Тырца ў горад В. да цёткі, якая працавала ў канторы запалкавай фабрыкі. Тырца пачала часта бываць у канторы. Потым, з фабрычнай бібліотэкі кніжкі пачала браць. Былы сакратар комсамольскага колектыву Бабаеў заглядзеўся на Тырцу, спадабалася, а Бабаева ў горадзе ведалі. Амаль што кожны сабака

ведаў яго, невялічкага, з белымі зубамі, валасы сукрыстыя, чорныя. Была вясна. Бунтавала маладая кроў у жылах. Штосьці ўзьнімала з нутра. І гэта штосьці туманіла галаву, цягнула на вуліцу, хацелася дыхаць сьвежым, пунцова-росным надвор'ем. Бабаеў пазнаёміўся з Тырцай. Далёка зайшло ў іх знаёмства. Калі ня глянеш, заўсёды ўдваіх. Прайшло больш двух месяцаў. І нейкім чынам Тырца апынулася на фабрыцы. Вядомая рэч—протэкцыя. Але ніхто аб гэтым не заікнуўся, бо Бабаеў—сакратар комсамольскага колектыву—актыўны рабкор. Адны яго паважаюць, другія баяцца. Таму і маўчалі.

Далёка зайшло ў Тырцы з Бабаевым. Толькі нешта раптам між імі выйшла нейкая недарэчнасьць. Тырца нацэлілася на экономпрацаўніка Сьцёпку Васюковіча. Прыгожы хлацец. З залатым зубам, заўсёды чысьценькі. Бабаеў засумаваў. Апусьціў нос. Хутка яго за бязьдзейнасьць зьнялі з сакратарства і паслалі на вёску.

Сьцёпка-ж прылёг за Тырцай. З год яны важдаліся. На фабрыцы, як у бубен білі. Сьцёпка вяжэніцца. Але прайшоў год і Сьцёпка выветрыўся з галавы Тырцы. Толькі-ж Тырца на-

доўга засталася ў памяці Сьцёпкі. Ён адразу, як толькі ўбачыў, што Тырца пахаладзела, ажаніўся. А ўсё-ж Тырцы доўга ня мог забыць. Мабыць яшчэ і цяпер носіць на сэрцы цяжар. Толькі ня бачна гэтага, бо каханьне не комсамольская нагрузка.

Тырца хутка пасьля ростані з Сьцёпкам узяла на прыкмет Аўгуста Бумбэра. Малады, надзвычай прыгожы хлапец. Любіць фізкультуру, але-ж ня менш і дзяўчат.

IV

А комсамольцы весяліліся. Шмат каго з іх ня цікавіла становішча работы цэхавых ячэек. „Сяброўскія вечары“ ўвайшлі ў моду. Клюбу пры фабрыцы ня было. Таму і ішла моладзь на ўскраіны гораду „разьвесьці душу“, павесяліцца.

У горадзе В. шмат ускраін, брудных, гразкіх, п'яных. Порхаўка, Шалудзіўка, Дымкі, Прыстань, Вадапой. Кожная з іх мае свае асаблівасьці. Мае свае межы. Мае сваіх дзяўчат. Сваіх гарманістаў. Сваю „добрую цётку Матрону“— самагоншчыцу. Часта бываюць між хлапцамі ўскраін бойкі. Больш усяго пачынаюцца яны з-за дзяўчат. Ня ведае вадапоец, што за дымкаўскай

Мартай дымкаўскі Грышка—гарманісты прыляпётвае. Спаткае вадапоец Марту ў горадзе, ну і правядзе яе да дому. А ўвечары, калі сьцямнее, закрочыць дамоў. Вуліцы-ж цёмныя, хмурныя, ды глядзяць з пагрозай. Бачыць вадапоец насустрач хтосьці ідзе. Падыходзіць. І бац у морду. Раз, другі, трэці. Добра, калі ўдасца ўцячы, а то іншы раз так накладуць, што чалавек ня зможа і несьці, і ў такіх выпадках яго даводзіцца адводзіць. Ой, колькі з-за гэтых ускраінскіх дзяўчат памаскаталі ўскраінскія хлопцы адзін аднаму галоў. Шмат на ўскраінах перапілі гарэлкі, шмат з-за глупства пралілі крыві. Толькі ў гэтым годзе ўскраіны гораду крыху ўсьцішыліся. Амаль усе дарослыя хлопцы разьехаліся—хто куды: адны вучыцца, другія ў Чырвоную армію, а трэція проста пажаніліся. Жонкі хвасты завязалі.

Быў ціхі суботні вечар. Сустракаючы вандруючых па вуліцы, павольна ішоў рыжанькі запрэжаны фаэтон, конік фурмана. Пакурваючы папіросы „Эксэлянс“ у фаэтоне сядзелі: Клочка, Клышко, Драздоў, Гаршчок і Хведзька Казыра. Перад імі стаялі футляры, якія ламаліся ад „спатыкачу“, „хлебнай“, „мадэры“ і інш.

Ехалі ня шыбка, але вось здарэньне. Конь пачаў спатыкацца ўсё часьцей і часьцей. І нарэшце стаў. Хлопцы кінулі ў паветра некалькі „матаў“ і, узяўшы свае футляры, рушылі пехатой. Яны адчувалі сябе вельмі няпрыемна. На вуліцы было шмат знаёмых. Пыталіся:

— Куды гэта вы, хлопцы, накіраваліся?

А што адкажаш? Няма чаго адказаць. Прапушчалі хлопцы між вушэй гэта запытаньне. Зьвярнулі ў завулак. Завулкам выйшлі на Полацкую. Добра тут. Далёка ад фабрыкі, ад іркага вока знаёмых. Некалькі крокаў і стараэнькая хата. Пазірае на вуліцу сваімі заімшэлымі сьценамі. Увайшлі. За сталом сядзелі дзяўчаты і гулялі ў карты.

— Маё з кістачкай гаспадыні,—прывітаўся Озік.

— Наша вам,—адказала Рузя. Слова за лова і гутарка. Ды такая вясёлая, звонкая. 'аварылі шмат. Радасная ўсьмішка панавала а тварах прысутных.

Больш за ўсё сьмяялася Каця. Чатыры мезяцы ад дня яе прыезду на фабрыку. За гэты ас яна амаль з усімі азнаёмілася, з комсамолмі пасябравала, з комсамольцамі падружыла. больш таго, Клышко пачаў яе лічыць сваёй.

І сапраўды. Між Кацяй і Клышко ўзаемаадносіны зрабіліся такімі, што на фабрыцы гаварылі:

— Ну, відаць ужо, на гэтай Астаповіч наш Клышко задавіцца.

У Каці была нагрузка. Яе зрабілі тэхнічным сакратаром бюро колектыву. Кацяя прывяла ў парадак усе пратаколы, падшыла абежнікі, завяла справы.

Сёнешні вечар дзяўчаты зьбіраліся зрабіць даўно, але ўсё не выпадала. Ня было дзе. Дый часу не ставала. Пакуль вось маці Рузі не паехала на вёску да сына, пакуль хлопцы і дзяўчаты крыху з працай уладзілі. Ну і вырашылі скарыстаць момант. Тырца аб вечары сказала Каці. Каці перш не хацела ісьці, але потым вырашыла.

— Ат, усёроўна, схаджу, дзе дзецца? Не сядзець-жа вечар дома.

Не пярэчыла Кацяя і таму, што за гэтыя чатыры месяцы прывыкла кожную суботу да пеўняў швэндацца. Прывыкла памаленьку піць, прывыкла па вечарох хадзіць. Да ўсяго прывыкла. На ўсё была спрытна. На Віктара-ж Корзуна пачала забывацца. Праўда, кожны месяц яна адсылала яму адзін ліст, які заўсёды

канчала тым, што доўгім, расьцяжным чыр-каньнем пяра ставіла некалькі літар, якія гаварылі: „... жыву ня дрэнна. Шмат працую. Час у абрэз. Ну, будзь здароў. Цалую, твая Каця“.

Віктар-жа слаў амаль кожны тыдзень ліст. А часам бывала, што пройдзе адзін—два дні і лістаносец прыносіць ці паштоўку, ці ліст. Віктар пісаў, што дужа цяжка працаваць бяз блізкага чалавека, што сумна яму і крыўдна, чаму ён адзін, „а той, каго я так кахаю, дзесьці далёка, далёка“. З кожнага яго ліста капалі сьлёзы. У кожным яго лісьце відаць было сэрца, якое плакала. Апошні ліст Віктар прыслаў тры дні таму назад. Яно было поўна суму. А ў канцы невялічкая прыпіска: „чакай, хутка прыеду. Мой месячны адпачынак скарыстаю ля цябе“.

Не радавалі Кацю лісты Віктара. Постаць Клышко зацямніла сабой Корзуна. Віктар быў далёка, а Клышко тут, кожны дзень на вачох, кожны дзень пад бокам. Кожны дзень зірк кіне, прытуліцца, за руку пацісьне. Таму і прызвычаілася Каця да Клышко. Ей ужо часам здавалася, што яна толькі ведае аднаго чалавека і аднаго кахае.

— А Віктар?—раптам паўставала ў памяці Каці. І тут-жа набягалі думкі, разважаньні, складаўся адказ.

— Ат, куды ён варты. Невялічкі, плюгавенькі, кніжок шмат перачытаў, а карысьці ўсё мала. Усёроўна такім-жа застаўся, у сабе, для сябе.

Клышко адчуваў сваю перамогу. Ведаў, быў упэўнены, што Каця яго кахае. І таму, калі прыйшоў на вечар, ды ня ўбачыў яе, крышку сумеўся і рот шчыльней зачыніў. Хацеў спытацца ў дзяўчат, чаму няма Каці, але не адважыўся: „падумаюць, што я дужа ўтрэскаўся“,— мільганула ў галаве. Дзяўчаты-ж бачылі, што ў сакратара ня ўсё на месцы, а Полька, схіліўшыся да Алесі, казала на вуха,

— Во, гэта дык каханьне! Бач ты, хвіліны без яе ня можа прабыць.

Дзяўчаты пазіралі адна на адну, і ўсьмешка бегала па іх тварах.

Клышко зірнуў у акно. Хтосьці прайшоў. У хаце падняўся гоман. Раптам яго хтосьці цап за твар. І тонкія пальцы зачынілі вочы. Здагадаўся. І так зрабілася прыемна і радасна, што здаецца, стаяў-бы вось гэтак доўга, доўга, ні аб чым ня думаючы, нічога ня гутарачы, нічога ня бачачы, і толькі-б трымацца за гэ-

тыя рукі, жадаючы іх адняць ад вачэй, і адначасова шчыльней прыціскаючы іх да шчок. Клышко пачаў тужыцца, каб зьняць рукі. Пачуліся галасы:

— Ты ня здымай, а скажы, хто гэта...

Не паслухаў, а мацней напружыўся. Адняў. Азірнуўся назад. Уся ў радасьці, усьміхаючыся, стаяла Каця.

— Ого, які ты моцны!

— На цябе сілы зьбяру.

Садзіліся за стол. Зноў, як і заўсёды, кожны з сваёй, папарна. Хлопцы паставілі на стол „мадэру“ і „спатыкач“. Пачалі. На двары займаўся цёмны летні вечар. А ў хаце звон бутэлек і шклянак заглушаў гутарку. Дзяўчаты чырванелі, рабіліся больш гаворкімі. Хлопцы зацягвалі песьні. Гоман, сьмех і паміж усяго гэтага пацалункі, п'яныя, з прыцмокам. І так да двух гадзін ночы. Напіўшыся, хлопцы разьляглiся, дзе хто, Клышко было млосна. Каця гэта заўважыла.

— Пойдзем на двор,—сказала яна.

Выйшлі. Цёплы летні ветрык калыхаў лісты клёнаў, разносячы прыемны пах. За хатай быў сад. Чуліся песьні нейкай птушкі. Яны ліліся на розныя лады, цягнуліся рознымі галасамі.

Сад. Каця ня помніць, як яны апынуліся там, бо сьвежае паветра, цёплы вечар абдалі яе, закружылася галава, самлелі ногі. Яна ішла, абапёршыся на Клышко.

— Сядзем.

Каця перш не хацела садзіцца, але Клышко ўжо сеў і, пацягнуўшы яе за руку, пасадзіў сабе на калені. Млявасьць абняла ўсё цела. А Клышко, ах, як ён моцна цалуецца. Вось ён вужам упіўся ў вусны Каці і хіліць, хіліць яе да долу, як вецер маладую бярозку. Падзьме вецер мацней і бярозка трэсьне, паламаецца. Каця адчувала пад сабой сыры дол, адчувала, як некалькі пацярак рос звалілася на твар... але, што гэта... што гэта... жарам гарыць цела... што гэта... а... а... ай... Ціха ўскрыкнула Каця і неяк зрабілася лягчэй. Толькі чамусьці захацелася плакаць, і Каця заплакала. Капалі сьлёзы з вачэй, валіліся росы з траў. А Клышко разваліўся на траве і, пазяхнуўшы, пацягнуўся. Каця ўзьнялася, кінулася на Клышко, абхапіла абедзьвюма рукамі яго за галаву, і пачала цалаваць моцна, бесьперастанку...

Днелася, калі Каця, прыйшоўшы дамоў, не храспранаючыся, кінулася на ложак. Дужа хацелася спаць.

## V

Пачалося з вечару ў падшэфным эскадроне. Рахункавод Мірсонаў увільваў каля Насьці, а калі праводзіў яе дамоў, то пад „крэндзель" узяў, на разьвітаньне моцна і горача руку пацініснуў.

— Клюнула,—гаварыў Юзік Клочка.—Наш член ЦК—Насьценка, з Чырвонай арміяй смычку ўмацоўвае. І сапраўды, Насьця і Мірсонаў усё часьцей і часьцей пачалі сустракацца, падоўгу быць разам, гутарыць бесьперастанку. У ячэйцы-ж, дык толькі плячыма ціскалі. Бо Насьця, як угарэлая, працавала шмат і добра, аўторытэт яе рос. Бо была Насьця з ліку тых камсамолак, якіх старыя рабочыя звалі „нашымі". Бацька Насьці спрадвечны пастух, нават і цяпер ганяе каровы ў поле. Неяк няпрыемна было Насьці слухаць людзкія языкі, а людзі часта казалі:

— Дрэнная ты, відаць, дачка, калі бацька, як і раней, кароў пасе. Зарабляеш ты добра, але бачна нічога ў хату не даеш. Ат, усе вы гэткія камсамольцы.

А што Насьця зробіць бацьку? Спрабавала разы са два сказаць:

— Кінь, тата. І без тваіх заробкаў пражывем.

А бацька ў адказ.

— О, не! На тваёй скуле верх ня будзе. Сам я сабе гаспадар. І ты мяне не чапай. Я дык вось табе не пярэчу. Хоць ты галаву скруці, нічога не скажу.

На гэтым і скончылася. Насьця больш бацьку нічога не гаварыла.

Чым, чым, а поэтамі ды пісьменьнікамі ячэйка была не багата. Праўда, быў нейкі Пятро Скабаленка. Напісаў вершы са два, адаслаў у рэдакцыю, а адтуль ані гуку. Мабыць з крыўды, мабыць з жалю, але хутка Пятро саскабліўся з гораду. З камсамолу яго выскаблілі. Стаў Пятро на чале забастоўкі, якую зравіла моладзь у адзнаку протэсту супроць несваячасовай выдачы спэцвопраткі.

Гарачы быў Пятро па сваёй натуры. Палкую прамову закаціў перад забастоўшчыкамі:

— Нас, таварышы, прыгнечваюць. Спэцвопраткі не выдаюць. Дзе-ж гэта бачна, каб на дзесятым годзе рэволюцыі, ды пролетарыят у лахманах каля машыны стаяў.

Выклікалі Скабаленку на бюро колектыву. Хацелі хлопцу давесьці, што ён ня праў, ды дзе там. З колікам у глотку ня ўлезеш. Ані, як бык, стаў на сваім.

— Праў я, ды ўсё.

Хоць ты кол на галаве чашы. Што не рабілі, не дапамагло. Так і давялося выключыць. А праз некалькі месяцаў Скабаленка зусім з гораду змыўся. Казалі, паехаў дзесьці на Урал. Пісаць ён нікому ня пісаў. Ніхто ў ячэйцы ня ведае і па сёнешні дзень, дзе Пятро, як жыве, як працуе. Мабыць ужо за гэтыя гады ён сам упэўніўся ў сваёй абмылцы. Мо' ён зрабіўся добрым комсамольцам, а мо' яшчэ і дагэтуль дзе-небудзь у кутку на вуха „добрым таварышом шэпча“: „нас прыгнечваюць“.

Але як-бы там ні было, хоць спэцвопратку пасьля забастоўкі зараз-жа выдалі, хоць са Скабаленкам разьлічыліся як належыць, але толькі чорная пляма засталася на комсамольцах фабрыкі. Бо ўсё-ж на чале забастоўкі стаяў комсамолец і ўдзел у забастоўцы прымала шмат іншых комсамольцаў.

На фабрыцы было 150 чалавек моладзі. А з іх 70 комсамольцаў. Дарма, што шмат хто з хлапцоў, і асабліва з дзяўчат, членскія ўзносы не плацілі і школы не наведвалі. Гэта Клышко менш усяго цікавіла. Ён, залажыўшы рукі ў кішэні, хадзіў з кутка ў кут па ячэйкавым пакоі, і галосна гаварыў.

— Мая цяпер справа ў сапраўды бальшавіцкім кіраўніцтве цэхавымі ячэйкамі. Агульны плян работы бюро колектыву склаў. Каляндарны плян сакратаром цэхячэек раздаў, ну і баста. Я, як сакратар, сваё зрабіў.

Пакуль Клышко даваў дырэктывы ды „наставленьні" сакратаром, работа ў цэхячэйках пачала кульгаць. Комсамольцы не наведвалі сходаў. Адносіны да вытворчасьці значна пагоршыліся. У скрыначным, набівальным, пакавальным і іншых цахох у працы комсамольцаў павялічыўся брак, дзяржаўныя грошы ляцелі ў трубу. Паводзіны комсамольцаў на вытворчасьці былі з рук вон дрэнныя. Комсамолка Рылькова ўкрала ў аднэй старай работніцы дзесяць гатовых марак. Гэлька Руцэвіч пабілася з-за рамы з партыйкай Двохінай. Сакратар цэхячэйкі, Златкіна Хана, спрабавала паставіць аб усім гэтым на бюро, хацела, каб, абгаварыўшы, „узгрэць", „намыліць", каму варта, холкі. Запрасіла на бюро Клышко. Сабраліся члены бюро. Прыйшлі выкліканыя. Чакалі. Усю фабрыку перакалаціла Хана, шукаючы Клышко, але-ж яго нідзе ня было. Пачалі бюро, дый усё-ж ня было аўторытэтнага чалавека, ня было каму тон задаваць. Пагутарылі, вынесьлі другую

вымову Рыльковай, паставілі на від Руцэвіч, але-ж гэта не памагло. Назаўтра ў цэху стаяў тарарам. Руцэвіч спрачалася з Двохінай. Другія комсамолкі распускалі плёткі. Загадчык цэху Лібэнзон быў беспартыйным, і „чапацца з партыйнымі“ дужа баяўся.

— Зачапіся з імі, дык яны на адным, на другім сходзе выступяць, успомняць тваіх дзядоў і прадзедаў, а праз некалькі дзён глядзі і за варотамі фабрыкі апынешся,—гаварыў Лібэнзон аднаму рабочаму сушыльшчыку. Баяўся Лібэнзон, каб ня выкрылі, што бацькі яго і продкі былі буйнымі гандлярамі. Дый сам Лібэнзон нядаўна кінуў гандляваць.

У цэхячэйках па ўсёй фабрыцы справы былі кепскія. Партыйнага кіраўніцтва амаль ня было. У партыйнай ячэйцы ня лепш былі справы. Большая частка партыйцаў узялася за сваю гаспадарку. Манія пабудова ўласных хат захапіла шмат каго з комуністаў. Як толькі абвясьціць гудок, што працоўны дзень скончаны, бягуць партыйцы дамоў, то заваленку рабіць, то крохвы ставіць, то стрэхі крыць. За сакратара ячэйкі прыслаў акругком партыі нейкага саўпартшкольца, які добра гутарыў, але-ж працаваць ня мог, ня ведаў прадпрыемства.

Сядзеў у памяшканьні партячэйкі, ды протаколы падшываў.

Клышко пачаў часта хадзіць у райком. На фабрыцы бываў дужа рэдка. Цэхячэйкі, як новая форма, ня маючы належнага кіраўніцтва, нічога не рабілі. А на фабрыцы сярод моладзі панавала п'янае раздольле. Пілі майстры. Пілі чорнарабочыя. Піла беспартыйная моладзь, пілі комсамольцы, пачалі выпіваць і комсамолкі. Глыбака пусьціла сваё карэньне п'янства. Ня было таго дня, каб на працу не зьявілася некалькі чалавек „вясёлымі", а часам і зусім п'янымі.

Набівальны цэх нават празвалі п'яным. І нездарма. Бо, пачынаючы ад рабочага Зязюлі, і канчаючы комсамолкай—падмятальшчыцай цэху—усе пілі. І калі здаралася, што загадчык цэху здымаў каго за п'янства з працы, то зацэху здымаў каго за п'янства з працы, то заўсёды пагражалі загадчыку „нацерці шыю", а комсамолец Гвозд, калі яго загадчык спрабаваў зьняць з працы (бо Гвозд ня мог устаяць на нагах), закрычэў на ўвесь цэх.

— Што, портфэля захацеў, перад начальствам хочаш выдранчыць? Ды ўсё на рабочых езьдзіш, вылучэнец!

Пілі работніцы. Рознымі хітрыкамі ашуквалі загадчыкаў цэхамі, каб тыя далі пропуск выйсьці

за вароты фабрыкі, а там гайда да крамы Дзяржсьпірту.

Комсамолкам дастаць пропуск удавалася лягчэй за ўсіх. Таму пакавальшчыцы, сабраўшы ў абедзены перапынак грошы, ткнулі іх у руку Лукер'і Хадок:

— Ідзі за пропускам, ды бяжы хутчэй, бо зачыняць краму. Падбегла Лукер'я да Лібэнзона, ды як завойкае.

— Чаго ты?

— Ой, не магу! Дайце хутчэй пропуск. Жывот зарэжа. Пабягу ў Лекпункт.

Як-жа ня даць? І Лібэнзон даў. Выбегла Лукер'я за вароты, азірнулася, ды гайда ў краму Дзяржсьпірту. Ведала, што адчынена крама толькі да трох гадзін. Трэба сьпяшацца, трэба прысьпець. І Лукер'я прысьпела. Зьявілася яна ў цэх з паўлітроўкай. А як толькі не падалі этажэркі, як толькі зрабіўся дзесяціхвілінны прастой, пяць работніц, а сярод іх дзьве комсамолкі, цягнулі з рыльца „сьветлую вадзіцу". Для весялосьці, для большай гаворкасьці, для таго, каб пасьля больш плёткі плесьці, зводзіць людзей на сварку.

На фабрыцы бронь была запоўнена ня цалкам. Вучняў было мала. Дый тым належных умоў

для вучобы ня было. Вучні ў майстраў былі падручнымі хлопчыкамі. Вучань Зэлькінд працаваў у сьлясарнай майстэрні фабрыкі. Не пасьпеў хлапец у майстэрні, як кажуць, і пяткі абагрэць, як манцёр Цьвік залічыў яго ў штат „пасыльных хлопчыкаў“. Падыходзіць Цьвік да Зэлькінда, дый загадвае:

— Зараз-жа зьбегай да сьлесара Мандрыка, вазьмі ў яго ад піва бутэлькі і занясі іх у піўную, што каля ракі.

Сабраўшы больш тузіны бутэлек, Зэлькінд баржджэй занёс іх у піўную і вярнуўся зноў на працу. Убачыўшы яго, Цьвік патрабаваў справаздачы аб выкананьні яго даручэньня. Тут выявілася, што Зэлькінд занёс бутэлькі ня ў тую піўную, куды гэта было патрэбна.

На дварэ ліў дождж. Стаяла золь. І усё-ж, ня гледзячы на гэта, Цьвік загадаў Зэлькінду бегчы і ўзяць бутэлькі з тэй піўной, у якую яны былі аднесены, і занесьці іх куда належыць. Толькі к абеду зьявіўся мокры Зэлькінд. Ня лепш было і Грышку Гляку. Яго прымацавалі да сьлесара яўрэя. Гэты сьлесар, ідучы ў пятніцу дахаты, запірае шафу з інструмантамі на замок. У суботу ён на працу ня прыходзіць, і Гляк цэлы дзень ходзіць бяз працы.

Майстры паднялі нос. Зьдзекваўся над вучнямі і падлеткамі майстра Ўладзімер Мікалаевіч Даўбавец. Ня любіў ён, калі звалі яго таварышом. Дужа ня любіў.

— Я вам не абы хто. Я вам не таварыш! Я вам майстра Ўладзімер Мікалаевіч.

Надта ўжо задобрым быў Мікалаевіч да сваёй радні. Калі пушчалі другую зьмену, ён пайшоў да дырэктара фабрыкі, пасьля чаго былі прыняты на працу сват, брат, кум і астатняя яго радня.

Акрамя гэтага ня любіў Мікалаевіч комсамолак дзяўчат. Калі ў яго цэх была прынята комсамолка Ліс, дык ён праз два дні адправіў яе за вароты фабрыкі. Зрабіць гэта яму ўдалося зусім проста. Пагутарыў з дырэктарам, нагаварыў таму сорак бочак арыштантаў, і—справа гатова. Ліс за варотамі. Праз некалькі часу была прынята другая работніца, таксама комсамолка, але і яна паляцела, бо майстра прызнаў яе крыху „сьлепаватай“.

Усё гэта рабілася пад носам цэхавых ячэек пад носам бюро колектыву, але ніхто гэтага нн бачыў, нікога гэта ня цікавіла, ніхто не зьвяртаў на гэта ўвагі. Вучні пачалі кідаць працу, бо працаваць было немагчыма.

## VI

Насьця Гулько была сумнай. Задуменнасьць лягла на яе твары. Мірсонаў зрабіў растрату. Яго арыштавалі. Хадзілі чуткі, што будзе суд, што прыклеюць хлопцу як сьлед. Насьцю гэта непакоіла, бо была гэтаму прычына. Некалькі дзён назад Мірсонаў сказаў:

— Ну, любая, хутка я дэмобілізуюся. Трэба толькі прымайстравацца на фабрыку. Тады мы з табой запішымся і зажывем.

Так ён сказаў. Але ўсё гэта бурылася. Ён арыштаваны. Ён у турме... Скончыла Насьця працу раней звычайнага і хуценька пабегла ў полк. Трэба даведацца, як і што. Знаёмыя хлопцы з канцылярыі іронічна расказалі Насьці аб Мірсонаве.

— Растрата невялікая, але будзе суд. І, як бачна, уляціць—як сьлед. Апякло гэта Насьцю. Яна і туды, яна і сюды. Не дапамагло, на месцы нічога не ўдалося дабіцца. Паехала ў Менск.

— Усё-ж я член ЦК. Няўжо-ж ня будзе ніякай палёгкі Мірсову. Скажу, што ён муж. Ну здарылася, рассарыў грошы. Але-ж завошта арышт? Завошта турма? Авось дапаможа, думала Насьця. Прыехала. Цэлых тры дні пра-

была ў Менску. У акругову, у вярхоўную прокуратуру хадзіла, часам сорам абымаў яе, калі заходзіла да начальства. Але як-бы там ні было, толькі дабілася свайго. Прыехала з цэнтру радаснай. І радасьць гэта была нездарма. Мірсонава выпусьцілі. Праўда, хоць з партыі выключылі, але:

— Ён і так будзе актыўным членам профсаюзу,—гаварыла Насьця.

Як толькі Мірсонаў выйшаў з-пад арышту, ён запісаўся з Насьцяй. Насьця зажыла. Комсамол-жа пакінула ў баку. Комсамол яе больш ня цікавіў. Бо быў муж. Трэ' было думаць аб квартэры, аб бялізьне для мужа. Трэ' было думаць аб тым, што хутка хтосьці народзіцца. Гэта было асноўным.

З кожным днём усё далей і далей адыходзіў ад комсамолу Шарко. Ён ужо рэдка наведваў сходы. Не хадзіў і на пасяджэньні акругкамолу. Яго гэта менш за ўсё пачало цікавіць. Бо дома старая маці і хата старая нахілілася. Дома маці гаварыла: „трэба, сынку, думаць, як далей жыць“. І здавалася, гэта-ж гаварылі і старыя сьцены хаты. І сам Шарко думаў пра гэта. Шмат думаў. „Усёроўна, політык з мяне дрэнны. Гаварыць я ня ўмею. Малапісьменны. Вучыцца

ехаць немагчыма. На каго-ж пакіну я старую. Не, трэба думаць як жыць, як быць у далейшым... Комсамол, што-ж ён мне даў? Ну, зрабілі членам акругкому, ну абіраюць мяне на ўрачыстых пасяджэньнях у прэзыдыум. Нарэшце хваляць мяне, кажуць, што я добры хлапец, стары рабочы... а далей — нічога. Работы я ніякай ня маю. Не даручаюць мне. На акругком прыдзеш, сядзеш у куточак, дык здаецца і век-бы там прасядзеў, ніхто-б цябе ня ўбачыў... Не, трэба жыць па-інакшаму. Можа і сапраўды маці праўду кажа... Жаніцца... Спрабую".

Не прайшло і трох месяцаў, як у бюро колектыву паступіла заява ад Шарко аб дабраахвотным выхадзе з комсамолу. Клышко патрымаў заяву ў руках, а калі прыйшла Каця, аддаў ёй заяву, сказаўшы:

— Прышый да справы.

Так растаўся Шарко з комсамолам. Нават на бюро колектыву пытаньне аб ім не паставілі.

Клышко адхіліўся ад Каці. Чаму? Каця ня ведала! Толькі ёй было крыўдна, бо Клышко пачаў рэдка заходзіць. А Каці цяпер хацелася бачыць яго часьцей, глядзець яму ў вочы доўга, доўга і ўпарта... Гутарыць з ім. Але-ж яго

няма, ён ня прыходзіць. Ды ня толькі дамоў ня прыходзіць, але і ў цэху дужа рэдка бывае. А раней ён так часта заходзіў да Каці, і доўга стаяў, сочачы, як шпарка рухаюцца яе рукі, як адна за аднэй кладуцца на стол гатовыя карабкі сярнічак. І Каці было радасна, і працаваць весялей. А пасьля вечару ў Рузі ўсё зьмянілася.

— Як толькі я не магла заўважыць гэтага раней... Які ён брыдкі... Што-ж... свайго дасягнуў, а цяпер і воч ня хоча паказваць. На апошніх вечарох сядзіць, ды на другіх вочы пітуліць. А мяне і заўважаць ня хоча. Эх, дурная я, дурная!..

Дзяўчаты гаварылі, што прыйшла чарга і Каці зрабіць вечар.

— Досыць на нас выяжджаць. Давай і ў цябе гульнем.—І гульнулі. Як толькі прыйшла субота, ды настаў вечар, так і пачалі зьбірацца. А калі „хэўра“ сабралася, каля парогу запыхкаў самавар.

— Значыцца, вечар за шклянкай гарбаты,— кінуў, увайшоўшы, Клышко.

— Так, так, таварыш сакратар. Бо мы ўжо хварэем на кішанёвыя сухоты. Віна няма за-вошта купіць. Даводзіцца гарбатай задаваляць свае патрэбы, — гаварыў Юзік, стоячы перад

люстэркам. Клышко не адказаў. Рысы задуменнасьці ляглі на яго твары. Учора сакратар райкому даваў яму ахэлікаў. У газэце зьявіўся артыкул аб бязьдзейнасьці бюро колектыў, аб тым, што „сучаснае кіраўніцтва колектыву нічога ня робіць. Гэта пагражае разваламі усёй работы“.

— А прычым тут я,—спрабаваў аднекваццa Клышко.—Паказаньні ячэйкам, у прыватнасьці сакратаром цэхавых ячэек, я штодня даю. Бюро колектыву засядае рэгулярна. Тэхнічныя справы ў парадку. Што-ж ад мяне яшчэ патрэбна?

— Патрэбна жывое штодзеннае кіраўніцтва, а не абежнікі і рэзолюцыі, якія ты пішаш davolі добра, і якія мы пішым яшчэ лепш. Трэба, браток, менш пісаць, а больш кіраваць, і потым менш швэндацца з Астаповіч.

— Ну, гэта ўжо мая асабістая справа. Хачу швэндаюся, хачу не. Хоць ты і сакратар райкому, але нос ня туды сунеш.

Клышко завярнуўся і выйшаў з райкому. А ідучы з райкому, думаў: „А мо' і сапраўды Каця вінавата? Не пайсьці заўтра да яе на вечар... Не! Лепш схаджу. Крыўдзіцца ня будзе“.

## VII

На пэроне было шмат людзей. У невялічкім станцыённым садзе грала оркестра. Віктар зьлез з цягніка. Вышаў на вуліцу і спыніўся. Горад для яго быў зусім незнаёмы. Чуваць было, як гудуць гудкі, як дзесьці сакоча мотор. Віктар зірнуў на гадзіньнік. Было роўна дзьве гадзіны дня. Потым ён накіраваўся ўздоўж вуліцы, абапал якой стаялі нізкія драўляныя хаты. Мураваныя-ж дамы былі толькі дзе-ні-дзе. На вуліцы людзей не асабліва. Час ад часу прабягалі аўтобусы. Завярнуў Віктар у гарадзкі сад. Аблюбаваў мясьціну, дый лег. У целе адчувалася стома. Заплюшчыў вочы і задрамаў. Нейкія звонкія гукі заплавалі ў садзе. Чуў Віктар гэтыя гукі, а зразумець ня мог, што, адкуль. Можа сон. Расчыніў вочы. Сонца садзілася за лес. Гудзелі камары. У садзе грала оркестра... Змахнуўшы рукой ігліцы з твару, Віктар падыйшоў да хлапца, які, лежачы на баку, чытаў ні то Кервуда, ні то Лёндана.

— Скажэце, таварыш, дзе тут гасьцініца?— Хлапец абвёў Віктара вачыма, і, усьміхнуўшыся адказаў:

— Гасьцініцы няма, а заежджы дом Фідзельгольца ёсьць. Як выйдзеце з саду, так павярнеце направа і ідзеце аж да вагзалу. Перад вакзалам будзе завулак, вы ў яго зьвярнеце. А там ужо і ўбачыце шыльду.

— Дзякуй! — Віктар пайшоў. Ня ўсьпеў ён дайсьці да каліткі, як яна расчынілася, і ў сад шмыгнула чатыры хлопцы. Апошні паказаўся Віктару знаёмым.

— Пісклігін!?

— А, каго я бачу!.. Таварыш Корзун, маё вам... Куды накіраваўся?.. Якімі хвалямі, з якіх берагоў прыбіла?.. Пажываеш як і чуваць што... І каб Віктар чакаў канца, дык мусіць не дачакаўся-б.

— Іду я, таварыш Пісклігін, у заежджы дом, ды вось ня ведаю, дзе ён.

— У заежджы дом? — перапытаўся Пісклігін.—Чаму гэта?.. А да Пісклігіна ты што, не жадаеш зайсьці, грэбуеш... У мяне, брат, пакой вялікі, і ложак шырокі. Хопіць месца.

Віктар згадзіўся пайсьці да Пісклігіна. Кватэра знаходзілася за вагзалам. Па дарозе Віктар расказаў, што фабрыка цяпер спынілася на месячны рамонт, і што ўсе разьехаліся.

— Я-ж тыдзень кіраваў рамонтнымі работамі цэху, а тыдзень вырашыў патраціць на наведваньне радні і знаёмых.

Пісклігін уздыхнуў. Ён здагадаўся, каго прыехаў наведаць Віктар. Ведаў, што дарэмны гэты прыезд, але маўчаў. Для ўсяго ёсьць свой час.

Віктару не хацелася пытацца аб Каці. Неяк няпрыемна. Таму ён і пачаў з другога.

— Ну дык хваліся Пісклігін, як вы тут жывеце. Як вас прынялі? Працуеце як? Што чуваць з Фядотавым? Мабыць ён у комсамол уступіў? Як Астаповіч жыве?

— Ат, браток, жывем, ківаемся. На сьмерць спадзяваемся. Авось, як прыдзецца паміраць, дык і некаму пахаваць. Жывем, братку, як дзень, так ноч, абы суткі проч.

— Дрэнна, значыцца, жывеце.

— Не, не асабліва, што дрэнна, можа быць і горш.

— Чаму?

— А таму, што парадку няма на фабрыцы. Партячэйка не працуе. Дырэктар з партфэлю не вылязае. Фабком пляны піша, да камісіі складае. А сакратар комсамольскага колектыву за тваёй Кацюшкай прысьцёгвае.

— Так, кажаш, прысьцёгвае?

— Ды не адзін я кажу, усе кажуць. Толькі, па-мойму, тут і казаць няма чаго, бо гэта відавочна.

— Кажаш, відавочна?

— Вядома,—відавочна! Сам я бачыў, як ён каля яе віляе. Да дому праводзіць. А хлопцы казалі, што і вечары ў яе бываюць, і ён на іх прысутнічае. Часам і начуе ў яе.

— Так, так!

— Ды, што ты, як няпрытомны?.. Ну вось і мая кватэра.

— Дзень добры, дзядзька Рыгор!..

— Добры дзень,—адказаў Рыгор, чыгуначны стрэлачнік.

Віктар нібыта гэтага ня пачуў, не заўважыў. Ён мімаволі пераступіў парог. Мэханічна паставіў у куток футляр. Ногі не балелі, а хацелася сесьці. Зрабілася млосна. Дастаў хустачку, выцерся, сеў. Чагосьці хацелася Віктару, а чаго, ён і сам добра не разумеў. Чамусьці перад вачыма паўсталі палі, зялёны луг, і ён, Віктар, невялічкі хлопчык, сядзіць на кані і едзе шпарка, шпарка. Застаўся ад канюхоў. Бо трэба было снапы з брыкі выкінуць. Ня вы-

кінуў-бы, дык дзядзька Ян Кавалеўскі, заможны шляхцюк, у якога Віктар служыў, даў-бы лазьню... Сьпяшаецца Віктар, каб дагнаць канюхоў. Во, во чуваць іхныя галасы, гутарка, чыясьці кабыла заірзала, здаецца Кузьмы Верхаводкі... З боку балоцістыя мясьціна — Стажарня. Чаму яе так завуць — Віктар ня ведае дый гэта і не патрэбна. З балота выцякае невялічкі равок. Кажуць, што гэты равок аж у Дзьвіну каля Полацка ўпадае. Віктар глядзіць уперад і думае: „вось убачу равок, суцішу каня, а пераеду, тады зноў падганяю“. Раптам, нібыта сьвятыя анёлы паднялі Віктара. Валасы сталі як у вожыка. Перш падскочыў Віктар, а потым грукнуўся вобземлю. А конь, як бег, так аднэй нагой проста на грудзі. Віктару здалося, што яму на грудзі зваліўся вялічэзны камень, і камень павольна ціснe да зямлі. Хацеў крыкнуць, разьняў рот, але паветра ня было. У роце зрабілася суха. І толькі буйныя сьлёзы пакаціліся з вачэй. Плакаць, плакаць захацелася Віктару, ён узьняў галаву, зірнуў і нічога ня ўбачыў, бо вочы былі поўныя сьлёз.

Прайшло з паўгадзіны. Пакуль Пісклігін мыўся, ды апранаўся, шмат аб чым думаў за гэты час Віктар. Галоўнае, гэта ён вырашыў,

цьвёрда вырашыў, абавязкова пайсьці да Каці. Аб гэтым ён сказаў Пісклігіну.

— Добра,—згадзіўся той.

Выйшлі, калі на дварэ было ўжо цёмна. Віктару не хацелася гутарыць і ўсю дарогу ён маўчаў. Пісклігін па сваёй натуры быў гаваркім хлопцам, але-ж, калі Віктар не адказваў на яго запытаньні, калі Віктар рэагаваў на яго словы маўчаньнем, дык і Пісклігін змоўк.

Падыходзілі да дому, дзе жыла Каця.

— Вось яе цытадэля, — прамовіў Пісклігін

Віктар маўчаў, акно было адчынена, і яшчэ на вуліцы хлопцы пачулі, як з пакою вылятаў звонкі сьмех.

— У дрэнную пару мы, браток, трапілі. Чуеш сьмех? Значыцца наш актыў чарговую гастроль адкалвае... Што-ж, зойдзем.

— О, не, Пісклігін, няпрошаны госьць часам горш за злодзея. Лепш мы зірнем у акно, пабачым, што там робіцца Хоць і нядобра пад вокнамі сачыць за чужой радасьцю, але-ж калі трэба, дык трэба.

І Віктар першым зірнуў у акно. Ён бачыў, што Каця, тая самая Каця, якую ён апошні раз бачыў год назад, сядзела поплеч з нейкім хлопцам. Пісклігін таксама зірнуў.

— Ну, вось бачыш? Гэта і ёсьць твой сапернік. Значыцца я табе не маніў. Факт на далоні.

— Так, так... Ну цяпер пойдзем.. Пойдзем, браток. Толькі не да Каці, а да цябе на кватэру... А можа ты ня пойдзеш? Шпацыраваць хочаш? Дык ідзі... Я і адзін траплю на тваю кватэру... Адпачну, дужа мне цяжка.

Зьдзівіўся Пісклігін.

— Вось табе і раз.. Гарэў да Каці, а цяпер адразу... Што, апёкся?.. Зьмена, браток, зьмена... Кажаш да мяне, ну пойдзем... Адпачні. А заўтра яе даведаешся.

І хлопцы завярнулі аглоблі назад. Праз акно ляцеў звонкі сьмех.

Назаўтра золкам выйшаў Віктар Корзун ад Піскліґіна. На вагзале чакалі прыход кур ерскага. Віктар узяў білет і праз чатыры гадзіны быў у сваім родным горадзе.

## VIII

З акругкому прыехаў інструктар тав. Чунь. На бюро райкому ён так інформаваў прысутных аб мэтах свайго прыезду:

— Паўгода, як комсамолія запалкавай фабрыкі перайшла на новыя формы працы—цэхячэйкі. Справа гэта ў нашай акрузе, дый ва

ўсёй організацыі ЛКСМБ новая. Вось і прыехаў я, каб азнаёміцца, як прывілася гэтая новая форма, прыехаў, каб разам з райкомам правесьці абсьледваньне становішча работы, зрабіць адпаведныя вынікі і праз наш комсамольскі друк азнаёміць усю організацыю. Калі ўсё добра, калі цэхячэйкі сябе апраўдалі, калі яны маюць добрыя практычныя дасягненьні, добрую практыку ў рабоце, дык патрабаваць, каб і на іншых прадпрыемствах былі організаваны цэхавыя ячэйкі. Калі-ж практыка пераходу ад зьменных ячэек на цэхавыя на запалкавай фабрыцы сябе не апраўдае, тады наша задача адшукаць прычыны гэтага. Можа наш новы мэтод патрэбна будзе адмяніць, можа ён не адпавядае тым запатрабаваньням, якія прад'яўляюцца жыцьцём. Вось і ўсё, што трэба зрабіць райкому? На маю думку — трэба вылучыць у дапамогу мне чалавекі чатыры добрых комсамольцаў, і мы з заўтрашняга дня пачнемработу.

Бюро райкому згадзілася з прапановай Чуня. Аднагалосна была абрана камісія ў складзе Чуня, Клочка, Горкінай ад ячэйкі папернікаў, Мухіна ад будаўнікоў і Пісклігіна.

Першае пасяджэньне камісіі адбылося пасьля сканчэньня працы. Пісклігін прыйшоў першым.

— Як прозьвішча,—спытаўся Чунь.

— Пісклігін.

— Ну, будзем знаёмы, Чунь.

Пісклігін пацiснуў руку.

Прыйшлі астатнія члены камісіі. Чунь і з імі пазнаёміўся. Ён спытаўся па чарзе ва ўсіх членаў камісіі, хто з іх і што робіць у ячэйках. Высьветлілася, што Горкіна АПО ячэйкі. Мухіна сакратар ячэйкі. Пісклігін экономпрацаўнік цэхячэйкі, а Клочка прадстаўнік ад моладзі ў РКК.

— Кепска, што ўсе вы загружаны, але што зробіш. Давядзецца зьмірыцца... Я вось што прапаную, таварышы! Разьмяркуем абавязкі такім чынам: Мухін—работа цэхавых ячэек і бюро колектыву сярод моладзі. Сюды ўваходзяць пытаньні росту, разгортваньне культурна-масавай работы. Горкіна—работа АПО. Ёй давядзецца пазнаёміцца з пастаноўкай вучобы цэхавых ячэек, з выпіскай газэт, з культурна-выхаваўчай работай, ну і астатнія пытаньні. Клочка—быт і вучнёўства, не, лепш адно вучнёўства. Ну—можна экономработу: запаўненьне броні павінна сюды ўвайсьці, аплата працы моладзі і гэтак далей. Пісклігіну-ж, я думаю, трэба даручыць пытаньне быту. На гэтым

фронце, здаецца, будзе ня ўсё добра. Я-ж акрамя таго, што буду сачыць за ўсёй вашай работай, бяру на сябе кіраўніцтва як з боку партячэйкі, так і з боку райкому.

— Галоўнае кіраўніцтва з боку бюро калектыву цэхавымі ячэйкамі,—кінуў Пісклігін.

— Вядома, што і гэта.

Члены камісіі згадзіліся з прапановай Чуня і ўмовіліся зараз-жа распачаць работу.

Здарылася так, што Чунь ішоў разам з Пісклігіным. За тыя два дні, што прабыў Чунь на фабрыцы, ён адчуваў, што ня ўсё ладна ў калектыве і цэхавых ячэйках, ня ўсё на месцы, таму і цягнула спытацца.

— Скажы ты мне, таварыш Пісклігін, як хлопцы адносяцца да Клышко.

— Гледзячы, якія хлопцы.

— Я цябе не разумею.

— Пабудзеш дольш—убачыш больш, тады і зразумееш.

— Не, дык ты ўсё-ж, Пісклігін, скажы хоць бы сваю думку.

— Маю... Можна... Ведаеш, шчыра кажучы Клышко не сакратар, а бабнік... Можа ён і быў добрым хлопцам, але за апошні час сапсаваўся хлапец.

— Здорава!

— Вось табе і здорава. Ты, брат, паслухай, што кажуць на фабрыцы аб ім. Ды яно і факт. Колькі ён дзяўчат перамацаў, дык мы з табой толькі і хлеба не пераелі...

— Ты аб дзяўчатах кінь, Піскліган. Бо і сам бачу не манах.

— Тут справа не ў манашастве. Але-ж калі ў комсамольца дзяўчына мэта... дудкі. Я, брат, ня згодзен. А з Клышко здарылася гэта... Задавіўся хлопец на дзяўчатах.

— Па твойму выходзіць, што Клышко згублены для комсамолу і партыі... Навошта-ж тады вы яго трымаеце за сакратара.

— Ня трэба, каб па-мойму выходзіла. Вось пазнаёмішся як сьлед з работай колектыву, паслухаеш, што на фабрыцы гавораць, дык і патвойму выйдзе... А наконт таго, што Клышко сакратарствуе, дык колектыў тут ня прычым. Бо на перавыбарчым сходзе хлопцы хацелі скінуць, а начальства, значыцца, райком, падало за яго голас.

Калі разьвіталіся, Чунь глянуў усьлед Піскліну і падумаў: „ну і вужака, вось і працуй з такім! Гару, здаецца, узваліў-бы сакратару на плечы. А між іншым—доля праўды ў яго сло-

вах, як бачна, ёсьць... Трэба пільней узяцца за абсьледваньне работы!

Схіліўшыся над сталом, сядзела Каця. Перад ёй ляжаў ліст ад знаёмых роднага гораду. А ў галаве, адна адну падганяючы, беглі думкі... „Значыцца Віці няма, ажаніўся. Першае каханьне дымам. Чаму? Пісклігін кажа, што я прычына. Ня веру. А можа сапраўды Пісклігін праў? Але-ж адкуль ён ведаў... А... ён прыяжджаў, яму хтосьці нагаварыў пра Клышко, пра маю сувязь з ім... Я яму мала пісала... Я зьняважыла яго... Я,—можа Пісклігін і праў? Каця ўсхліпнула.

На дварэ ішоў дождж. Пачуўся стук у дзьверы. Момант, і хтосьці спытаўся.

— Астаповіч дома?—І крокі зашамкалі ў кірунку да дзьвярэй пакою Каці.

— Заходзьце,—адказала на стук у дзьверы Каця. Увесь мокры пераваліўся праз парог Чунь.

— Ну і льлець-жа на дварэ, як з вядра. А цемень—хоць у вока пальцам! Бачу—у цябе гараць вокны. Давай, думаю, зайду...

— Зайшоў,—дык сядай. Пагрэйся, абсушыся. Ды хваліся, дзе так позна швэндаўся.

— Швэндаўся я па фабрыцы. Хадзіў, знаёміўся з другой зьменай. Ну-ж і пролетарыят

там! Ведаеш, дужа жыдзенькі. Набралі абы каго. Стаіць дзяўчына, кінула працу, і нос трэ. У люстэрка гляне, ды зноў за пудру... Комсамольцаў мала. Трэ' будзе над гэтым падумаць, Трэ' ў другую зьмену пасляць некалькі лепшых хлапцоў для разгортваньня работы.

Валодзя некалькі падумаў, закурыў і потым, зьвярнуўшыся да Каці, спытаў:

— Слухай, Астаповіч, што ты нешта ў апошні час адлыньваеш ад ячэйкі? Зволілі мы цябе па тваёй уласнай просьбе ад тэхнічнай работы, зрабілі цябе цэхавым экономпрацаўнікам, а работы тваёй ня бачна?

Каця маўчала.

— Я пытаўся гэтымі днямі ў загадчыка цэхам, ён кажа, што ты пачала менш вырабляць і запалак... Сакратар вашай ячэйкі кажа, што ты ў рабоце не дапамагаеш... На сходах цябе ня відаць... Членскія ўзносы зборшчык кажа даўно не плаціла...

— Ты штосьці дужа клапоцішся аба мне,— сур'ёзна сказала Каця.

— Я аб табе клапачуся таму, што ты комсамолка і... А клапаціцца аб кожным комсамольцу—гэта мой непасрэдны абавязак ня толькі, як сакратара колектыву, але-ж і як ко-

муніста... Скажы, ты чым-небудзь нездаволена? Праца табе не падабаецца, ці яшчэ што? Ня хочаш на бюро сказаць—скажы мне асабіста. Змагу бяз бюро што-небудзь зрабіць, зраблю... Але-ж так беспадстаўна апускаць рукі, адлыньваць ад работы—тут я, брат, не разумею. Вось зноў, гэтымі днямі прыйшла Гдоўская, дый кажа: не магу працаваць у пакавальні. Пайшлі, пагутарылі з дырэктарам, з загадчыкам цэху,— і дзяўчыну перакінулі ў скрыначную. Зрабілі там яе АПО ячэйкі, паставілі вучыцца да машынкі. Я сёньня зайшоў, ды яна і дзякуе. Рада дзяўчына. Так што калі табе праца не падабаецца, давай, выкладвай, у чым, чаму...

У Каці балела сэрца. Яна зірнула на Чуня, а той сядзеў, убіўшы вочы ў падлогу. „Чаго ён хоча ад мяне“, падумала Каця. І ўголас дадала:

— Слухай, Чунь, ты жанаты?

— ?!

— Кажы, што-ж ты маўчыш?

— Жанаты,—зьдзіўлена, зірнуўшы на Кацю, адказаў Чунь.—Чаму цябе гэта цікавіць.

— Бачыш, мне думаецца...

— Я цябе не разумею, Астаповіч. Бо цяпер мы адзін аднаго зусім мала знаем.

— Т [illegible] ..адумаўшы, сказаў Чунь.—У мяне ёсьць да цябе больш сур'ёзная справа.

— Давай.

— Учора райком адтрымаў ад акругкамолу дырактыўны ліст аб неабходнасьці пачаць правядзеньне вытворчага паходу комсамолу. Справа гэта новая. Практыкі няма. Думаў я, думаў, дый прыйшоў да таго, што ты павінна першай узяцца ў вашым цэху за ініцыятыву разгортваньня вытворчага паходу. Заўтра мы зробім бюро, заслухаем невялічкую інформацыю аб вытворчым паходзе, і абяром на чале з табой оргтройку.

— „Чаго ён да мяне прычапіўся... Пляце нейкую ахінею лухту... Як быццам ён стопроцантны... Знаем мы вашага брата. Недалёка ты адышоў ад Клышко. Пляцеш, пакуль свайго дасягнеш... Сабака... Усе вы такія". Праляталі ў галаве Каці думкі, а голасна яна гаварыла.

— Добра, я згодна.

— Я тым больш,—зьбіраючыся ісьці дамоў, сказаў Чунь.— Ну, бывай здарова... Ага, я вось табе кіну гэты ліст, ты пазнаёмся, прачытай, ды потым праінформуеш бюро.

— Усяго добрага, таба[illegible] — [illegible]лькі не-
шта мне боязна брацца за гэту справу.

— А ты сьвішчы, тады і боязна ня будзе.

— Слухай, Чунь, не забудзься, дзе будзеш валіцца, там пакланіся!

Чунь засьмяяўся.

## IX

Зьвінела вясна. Радасьць абымала палі і праз драмучы лес нёс ветрык вясны гэту радасьць да гарадзкіх ускраін. Загаманілі ўскраіны. Горад ажыў. Звонка перагукваліся заводзкія гудкі. І нёсься іх гул далёка, далёка, праз лугі, палеткі, над верхаўем дрэў, над паплавамі, балотамі, у сінюю бясконцую далеч. Маладое зялёнае лісьце шапацела—шушукала. П'яны пах вясны і распусьціўшыхся дрэў—упаіў Чуня. Адчыніў акно, і вясна напоўніла пакой кляновым пахам. Гойдалася пад акном кляновае лісьце. Спускалася ноч зорная, з поўным месяцам. Валодзя лёг на падаконьнік і ўпіўся вачыма ў ціхія начныя змрокі. Ні то сум, ні то жаль абымаў яго. Было крыўдна і на сябе, і на яе. І адначасова было шкода яе, тонкую, рослую, з вачыма, ні то шэрымі, ні то чорнымі.

Иожа вочы і былі шэрымі, толькі чорныя брові іадавалі ім чорны колер... А яе твар—толькі-б лядзець на ружовыя шчочкі, і—трымаючы за ухкія рукі, цалаваць яе ў мяккія, заўсёды ырвоненькія вусны. Твар белы, чысты, дзяочы, чорныя падстрыжаныя валасы. Усё гэта аўстала перад Валодзем.

Неяк па-асабліваму дужа, дужа зашчаміла эрца.

— Чорт яе гэту вясну,—сказаў Чунь, адыоўшы ад акна.—Ветрык шугануў, стукнуўшыся, ічынілася палавіна акна. Зноў думкі.

— І ўсё-ж, яна больш вінавата. Можа і я віваты? Можа трэ' было жаніцца, не чакаць, олькі чаму-ж яна так недаверліва аднеслася і мяне... пабаялася бацькоў, а пасьля паслула іх... За інжынэра, нават стрыечнага брата, йшла... А я: „гой". За мяне ня можна... Зан... А як за стрыечнага брата ісьці замуж, ік тут і закон на бок, бо ён-жа інжынэр. я што? „Гой"... З ім яна зможа жыць, як ўсе „прыстойныя людзі"!.. А абяцала, распалася перада мной. Згаджалася. Чатыры ды вадзіліся... Ну, і сволач! А яшчэ комсака!—З хрыпам вырвалася ў Валодзі. Ён ад осьці плюнуў, узяўся за грудзі, сэрца білася,

як апантаванае. А з-за сьцяны чувадь было ці
хая песьня.

Лепш было, лепш было не хадзіць
Лепш было, лепш было не любіць,
Лепш было, лепш было дай ня знаці,
Чым цяпер, чыл цяпер забываці.

Валодзя распрануўся, загасіў электру, і, лёгш
на ложак, схаваўся з галавой пад коўдру.

— Хто яго ведае, як далей будзе? А паку
што, дык Чунь справы добра наладзіў. Хлопе
ён нішто. У цэхах аб ім ужо моладзь гаворыц
Толькі дрэнна, што слова ў яго вымучыц
цяжка. Хутчэй палціну дасьць, чым слова скаж

— Па-мойму, гэта ня дрэнна,—не згаджаў
Клочка з Піскліпіным. Хай сабе гаворыць мен
абы ён справу добра ведаў, і ў рабоце кірун
правільны даваў, а гутарыць—хай сябе ня г
тарыць. Ніхто яго не прымушае. Трэба будз
дык скажа, ня бойся. Дзе ён дзенецца.

Хлопцы параўналіся з хатай, дзе жы
Астаповіч.

— Давай, Юзік, зойдзем да Каці... А ведае
апусьцілася дзяўчына. Помніш, я табе каз
пра Корзуна. Гэта-ж яе першае каханьне. Аж
ніўся... А тут яшчэ справа з Клышко. Яго т

емнае зьнікненьне. Усё гэта паклала на дзяўчыну пячатку.

— Ты праў, Пісклігін. Была баба пуд, а зрабілася анучай. Ох, каханьне, каханьне.

— Што, і ты адчуваеш гэты цяжар на плячох?

— Кінь сьмяяцца!.. Зойдзем!—І Юзік першым завярнуў на двор.

— Добры вечар, Каця!.. Ой, е, е! Які ў цябе сур'ёзны выгляд. Як у Карла Маркса ў часе пісаньня капіталу.

— А ты яго бачыў тады?

— Гэта неабавязкова.

Каця засьмяялася.

— Над чым-жа гэта ты Кацюша, сядзіш? Можа дзеньнік вядзеш?

— Які там чорта дзеньнік! Бюро-ж учора аклалі. Толькі таму, што я не падрыхтавалася, захварэла крыху.

— Прычым тут бюро?

— А што ты ня бачыш, абежнік во ляжыць. Самы звычайны, сухі. Прынёс Чунь, ды ткнуў у рукі. На, кажа, прачытай, ды за справу бярыся

— За якую справу? Што, можа новая кампанія?

— І так, і не... Вы, хлопцы, чулі што-не-будзь аб вытворчым паходзе комсамолу?

— Я чуў,—адказаў Пісклігін.

— Здаецца і я чуў,—дадаў Юзік.

— Дык вось, прыйшоў да мяне гэтымі дня[illegible] Чунь, даў гэты абежнік, і сказаў рыхтаваці[illegible] брацца за справу.

— Эге, дык да цябе Чунь прыходзіў... Д[illegible] моў, значыцца.

— Прыходзіў, прыходзіў. А што, да мя[illegible] заходзіць ня можна? Вы-ж зайшлі. І яму мож[illegible] Што-ж у гэтым такога?

— Ды нічога. Толькі дзіўна неяк. Чорт [illegible] гэтых сакратароў! Цягне іх да цябе, як м[illegible] да мёду.

— Не, Юзік, ты памыляешся... Чунь-жа ж[illegible] наты.

— Ну, дык што? Гэта-ж нічога ня значы[illegible] Сёньня жанаты, а заўтра можа быць халасты[illegible] пажартаваў Юзік.

— О, Юзінька, для Чуня гэта шмат ш[illegible] значыць.

— Ды кіньце вы глупства малоць,—у[illegible] шаўся Пісклігін.—Давайце лепш вось аб сп[illegible] вах пагутарым.

— Аб якіх-жа гэта такіх справах?

— Ды аб такіх. Чуню патрэбна дапамога. Хлапец хварэе за колектыў. З фабрыкі ня вылазе. А мы як раней ходзім насы апусьціўшы.

— Ты, праў, Пісклігін,—сказала Каця, стаўляючы на стол пузаты самавар.

Засядала бюро. Невялічкі ячэйкавы пакой быў набіты комсамольцамі. Чунь абвёў вачыма прысутных і адчыніў пасяджэньне. Слова атрымала Каця.

— Астаповіч, 15 хвілін, ня больш.

— Добра.

Каця расказала бюро аб вытворчым паходзе, аб мэтах і задачах, аб тым, як практычна ўзяцца за правядзеньне паходу, што трэба зрабіць. Пытаньняў ня было. У спрэчках выступіў толькі запрошаны на бюро дырэктар фабрыкі таварыш Міндлін. Ён паабяцаў, што з боку кіраўніцтва фабрыкі будзе зроблена ўсё магчымае для разгортваньня паходу. Рэзолюцыю зачытаў Пісклігін. Асноўнымі пунктамі ў рэзолюцыі былі: зараз-жа ўзяцца за правядзеньне паходу, абвясьціць конкурс на лепшы ўдзел цэхячэйкі ў вытворчым паходзе. Прасіць кіраўніцтва фабрыкі аказаць дапамогу цэхавым ячэйкам у стварэньні комсамольскіх брыгад. Бюро скончылася

хутка. І як здавалася Чуню, прайшло па-дзеламому. Кацю вылучылі старшынёй тройкі па правядзеньні вытворчага паходу.

## X

Лета зьмяніла вясну, восень зьмяніла лета. Жоўтыя лісты ўсьцілалі дол. Сумавала—плакала хмурая высь буйнымі дажджавымі кроплямі.

Каця выйшла з цэху апошняй. Ноч разьляглася чорная, змрочная. Папраўіўшы валасы, Каця закрочыла ўздоўж шырокай пясчанай вуліцы. Было ціха, ціха. Шуршэў пад нагамі пясок, а клёны ды каштаны здавалася дыхалі, рассыпаючы жоўтае лісьце. Такія ночы ўвосень бываюць рэдка.

Сёньня Каця, калі нагіналася за рамай, адчула як штосьці таўханулася ў жываце.

— Значыцца Рузя права. Я зацяжарыла.

Мімавольна рукі ляглі на жывот, памацала. Не, мусіць здалося, а можа і праўда. Якісьці цьвёрды камочак абмацала яна, раптам закружылася ўваччу. Каця ледзь-ледзь не наторкнулася на нейкую патарчаку. Здрыганулася. Потым зноў, павольна адмерваючы крокі, пайшла

ўздоўж вуліцы. І думкі ішлі разам з ёй, не пакідаючы. Ды думкі цяжкія, нясканчаныя. Адны зьмяняліся другімі. І здавалася, ня будзе канца ім ніколі, помакам рабілася галава.

— Чаму, гэты раптоўны стук у жываце, так неўспадзеўкі ўзрушыў жыцьцёвы супакой, чаму ён спужаў ціш думак, кінуўшы здаровы розум на блытаныя разважаньні. Дамоў? А што дома? Цёмная ноч і такі-ж цёмны пакой, ложак і самотнасьць такая-ж як і ўчора, заўчора... Не, лепш пахадзіць яшчэ гадзінку, другую, па сьвежым паветры, падыхаць усімі грудзьмі.

Разам з пеўнямі Каця пераступіла парог свайго пакою. Сон адабрала сьвежасьць ночы.

— А што далей?—Ва ўсю веліч паўстала перад Кацяй пытаньне.—Хутка на фабрыцы як у бубен заб'юць „Астаповіч дагулялася!“ Што рабіць?—Галава налілася нейкім цяжарам. Блыталіся думкі, зашчыміла ў грудзёх. „Э“,—вырвалася ў Каці.

— „Дурненькая, пытаецца, што рабіць,—аборт і ўсё. Некалькі хвілін страху і ты зноў вольная птушка“, хтосьці чужым голасам падказаў Каці.

— „Не, не, гэта не мае думкі, у мяне такіх ня было, гэта чужыя, толькі чые-ж?... А...—

Каця ўспомніла.—„На ложку ляжыць белая, як бяроста, маці. Акушорка складае ў футляр нейкі інструмант.

— Нічога, нічога, усё будзе добра...—гаворыць акушорка.

Тымі днямі Каця не хадзіла ў школу. Яна сядзела каля ложку, падавала маці вады і глядзела ў яе цьмяныя вочы“.

— Ма...—і зачапіліся ў горле Каці недаказаныя словы.

Коўзаючыся калёсамі па падлозе, засьцеленай тоўстай бляхай, коцяцца пустыя этажэркі. Хутка рухаюцца рукі ў пакавальніц. Ціш, ня чутно ні шуму, ні гаму. Час-часам хто-небудзь кіне слова, засьмяяецца і зноў ціш. Усе заняты працай. І толькі вэнтылятар у нястрыманым разгоне пяе звонкую перакатную песьню.

Мала цяпер у пакавальным цэху згарае рам. Мінуліся тыя часы бязуважлівых адносін да гатовай продукцыі. З асьцярогай бяруць работніцы рамы з этажэркамі. Ня труцца галоўкі запалак адна аб адну і таму не загараюцца. Мінулае пакавальнага цэху—прагулы, сваркі, гутаркі розныя ў часе працы, нізкая продукцыйнасьць працы. А цяпер зусім іншае. Зьмяніўся цэх і ні сам цэх, а людзі ў ім.

Прайдзецеся па цэху і вы ня ўбачыце ніводнае запалкі на падлозе. Менш стала „браку“, колькасьць „сору“ зьменшылася, атрымалася ўсё гэта з зусім простага комсамольскага вытворчага паходу, які пасьля ператварыўся ў вялікую справу—у соцыялістычнае спаборніцтва.

Узяліся комсамолкі - пакавальніцы, на чале з Кацяй, за правядзеньне паходу. Цяжка ім было ўзьняць на адпаведную вышыню працу. Сьмяяліся з іх старыя работніцы:

— Нічога ў вас, дзяўчаткі, не атрымаецца, пустая гэта справа.

Але комсамолкі не паслухалі, а наадварот, падвоіўшы энэргію, з усёй шчырасьцю і жаданьнем узяліся за стварэньне ўдарных брыгад. Час бег. Кожны новы дзень прыносіў новыя дасягненьні. Этажэркі хутчэй пачалі пусьцець. Продукцыйнасьць расла, комсамолкі свайго дасягнулі. Сто работніц запісалася—і пачало працаваць у брыгадах.

Глеба была ўзрушана. Насеньне соцыялістычнага спаборніцтва, кінутае на ўзварушаную глебу, пачало пускаць карэньне. Густа, глыбака, у самыя цёмныя заводзкія задворкі, па-новаму запрацаваў пакавальны цэх. Месяц, другі і пяцьсот работніц зрабілася ўдарніцамі.

— Вось табе і бабы,—гутарылі паміж сабою рабочыя іншых цэхаў.—Вазьмі ты іх за рубель дваццаць, калі яны нас у казіны рог запёрлі, у хвасьце пакінулі.

І сорамна, і крыўдна было шмат каму з рабочых.

— Як-жа гэта, мы ды ў бабскім хвасьце,— са злосьцю казалі макалі.

— Э-э-э, ня туды паехалі, тут справа ня ў „бабскім хвасьце", а ў тым што мы тым, што адстаем ад упакавальніц, нашу непрацаздольнасьць, несьвядомасьць паказваем. Давайце, вось, возьмемся, пакажам, што і мы ня лыкам шыты, што і мы можам працаваць—гаварылі хлопцы ініцыятыўнай групы па арганізацыі ўдарных брыгад.

І набівальнікі ўзяліся, ня вытрымалі. Жаданьне „дагнаць і выперадзіць" пакавальніц перамагло. Сто шэсьдзесят чалавек абвясьцілі сабе ўдарнай брыгадай. Шпарчэй закруціліся набівальныя машынкі, застукалі, б'ючыся аб „сабачку", валікі, мацней застукаў прэс-конвэер. І набівальны цэх, той самы цэх „бузацёраў", зрабіўся цяпер інакшым, зьмяніўся. Лепшымі зрабіліся рамы. Менш „двоек" пачало выходзіць; замест 30 скрынак з рамы пачало атрым-

ліваццa 36-37. „Масы“ менш псуеццa на галоўку, над парафінай ніхто ня глуміцца, продукцыйнасьць працы значна павялічылася. Нават самі набівальнікі, калі пасьля месячнай працы пазнаёміліся з вынікамі сваёй работы, ня верылі (?) у дасягнутыя вынікі. У працоўным уздыме яны ня прыкмецілі вялікіх посьпехаў, атрыманых дзякуючы соцыялістычнаму спаборніцтву.

Часта скардзіліся набівальнікі на шчапалёў. Шчапалі пярэчылі ў працы набівальнікам. Саломку для скрынак давалі дрэнную. Пытаньне аб якасьці ва ўсю веліч паўстала перад шчапалямі. Насупіўся загадчык цэху. Міндлін пачаў часьцей неведвацца, да працы прыглядацца. Задумаліся шчапалі.

— Трэба падцягнуцца. Далей так працаваць немагчыма—казаў загадчык цэху таварыш Маркаў. А добра калі чалавек зразумее, ён тады сам гарыць жаданьнем зьнішчыць тое дрэннае, а часам шкоднае, што ён рабіў раней. Добра, калі чалавек убачыць і зразумее свае недахопы, ён будзе старацца зьнішчыць іх. Так здарылася і з шчапалямі. Яны ведалі, што якасьць дрэнная. Напружыліся. І свайго дасягнулі. Стварылі ўдарныя брыгады, організавалі цэхавую вытворчую камісію, цэхавых сходаў некалькі склі-

калі, пытаньне аб якасьці продукцыі паставілі. Справы значна палепшыліся. Зьнішчыліся „клі-ны“ ў саломцы. „Гільза“ і „шыбэр“ згубілі касмацьцё. Набівальны і скрыначны цэхі бесьперапынна пачалі забясьпечвацца патрэбнай і па якасьці і па колькасьці „шчапой“. У брыгады запісаліся ўсе рабочыя і работніцы цэху.

Пакінулі скардзіцца на дрэнную якасьць „шчапы“ скрыначніцы. Іх ахапіў сорам за тое, што цэх застаўся ў баку ад агульнага ўздыму рабочых фабрыкі. Але гэта было нядоўга. Група комсамолак і комуністаў узялася за разгортваньне спаборніцтва. Воўкам глядзелі на пачынаючых гультайкі - скрыначніцы. Яны ледзь не пабілі комсамолку Клябанаву за тое, што тая сказала:

— Можна на дзьвёх машынках працаваць аднэй.—Бедная Клябанава і ўляцела-ж ёй.

— Падумаеш, учора на фабрыку прышла, а сёньня ўжо тон задае. Спрабуй сама, перайдзі на дзьве машынкі, пабачым, што ты тады запяеш.

І Клябанава перайшла. Першай перайшла. Спачатку было цяжка, а потым палягчэла, бо адна за аднэй пераходзілі скрыначніцы на дзьве машынкі.

XI

— Я ня ведаю, Ісак Аронавіч, што рабіць, Грынько зноў бузіць і сёньня замест 22 скрынак зрабіла толькі 17.

— А ты з Астаповіч гутарыла?

— Я яе і ў вочы ня бачыла. Раней, дык Каця прыходзіла ў нашу зьмену, а цяпер вось ужо тыдзень як у цэху яе нагі ня было.

— Гм... што-ж гэта з ёй такое... Можа захварэла, няхай-бы вы даведаліся... А пакуль, скажы сваёй брыгадзе, што заўтра сход. На сходзе ты зробіш справаздачу аб працы брыгады. Я прыду. Перадай Астаповіч, няхай і яна прыдзе.

Зазьвінеў тэлефон. Міндлін узяў трубку.

— Альлё... Хто? А-а-а... Чунь, здароў... што... важная справа... кажы... ды няма нікога... што... што... Астаповіч ня выйдзе на працу... чаму... цэнтральнае... ай-я-яй... перабілі... альлё... Чунь... ну, гавары, я слухаю... цэнтральнае, цэнтральнае..., а чорт-бы вас задзёр...—і Міндлін павесіў трубку.

* * *

Чунь быў у колектыве адзін. Ціха адчыніліся дзьверы. Увайшла жанчына.

— Вы будзеце Чуй.

— Я, бабка, толькі ня Чуй, а Чунь.

— А якая розьніца.

Яна азірнулася назад, кінула вокам на пако выблытала з хусьцінкі руку і падала Чуню не кую пісульку.

— Ад каго гэта бабка?

— Ад каго?.. Ад патаскухі-ж вашай... А зышоў сьвет на клін, круцяцца, круцяц набегае пуза, а потым атрута... Ну і тру цябе трут.

Пакуль бабка мямліла, Чунь прачытаў. Бел лягла на яго твары. Пот халодны выступіў. Е шклянку вады ды кінуўся да тэлефону.

— Цэнтральнае, цэнтральнае, дайце 52 Міндлін... альлё.

* * *

Ну і зіма-ж, рэдка бываюць такія на [Бел русі. Усю піліпаўку мароз прастаяў, ды та злюка, што ой-е ей. А цяпер недалёка „вялі чацьвер", а на дварэ сьцюжа, золь, выйсь на вуліцу боязна. Трашчыць па платох, ды п заўгольлю мароз, вецер-сібер лупіць бляху с стрэх... Чу, хрусь, хрусь, хрусь, хрусь. Нехт шпарка крочыць уздоўж вуліцы. Вось ён зьн

чэўку каўзануўся, ледзь, ледзь ня рынуўся. За плот схапіўся. Хрусь, хрусь і ўсё бліжэй і бліжэй. Чалавек. Ён сьпяшаецца. Куды? Рыпнула калітка і чалавек схаваўся за дзьвярыма дома. А, а... гэта-ж Чунь.

Ён увайшоў на кухню. Гаспадыня грэла каля печы плечы.

— Добры вечар.

— Вечар добры, сынку... Што, сьцюдзёна, пазяб... грэйся, грэйся.

— Ну як, Дар'я Янкаўна, з Кацяй?

— А грэйся, грэйся, усё добра. Прыходзілі нейкія вашы дзяўчаты, з імі гутарыла.

— *Што?*

— ?

— Я ўжо, Дар'я Янкаўна, награўся, пайду да хворай.

— А ідзі ўжо, ідзі, яна пэўна чакае.

Чунь пераступіў парог кухні, зрабіў некалькі крокаў і спыніўся перад дзьвярыма Кацінага пакою. Перш хацеў пастукаць, а потым ціхутка адчыніў дзьверы. Увайшоў. У пакоі стаяла цішыня. Цьмяна гарэла газоўка, ды чулася дыханьне. Валодзя зірнуў на ложак. Рог коўдры споўз і па белых нібыта пурпуровых грудзёх лунала плойма цьмянага сьвету, а па шчаках

Кацінага твару зацьвіталі чырвоныя кветкі, Чу
заставіў газоўку ад Каці газэтай і толькі ўз
ся за сьвежы нумар „Камсамольскі" як:

— Валодзя, гэта ты,—пачуўся з ложку мя
і ціхі голас Каці.

— Я,—і Чунь ціхімі крокамі падышоў
ложка. Нахіліўся, і з нейкай асаблівай шч
расьцю пацалаваў Кацю ў вусны...

Вышаў ён ад Каці позна, позна. Вецер-сі
дуў у самае нутро, нібыта знарок жадаю
змарозіць каханьнем сагрэтае сэрца.

## XII

*„Здароў брат Габра! Вінаваты перад т
бой, як ніколі. Але што зробіш, так склал
абставіны, што напісаць як сьлед усё аб с
ня мог. Прачытаўшы твой апошні ліст,
зрабілася сорамна. Ты зусім праўдзіва ск
дзішся на мяне. Я мала пішу. Я нічога т
аб сабе ня пішу. Правільна. Вось цяпер, у
чыўшы вольную хвілінку, пастараюся чы
нуць аб усім. Каротка, але аб усім.*

*Я цяпер сяджу ў пакоі бюро колекть
За сьцяной чуваць грукат і гоман. Музыкан
зьбіраюцца, хтосьці дзьме ў трубу. Сён
ў нас вечар, прысьвечаны першай гада*

спаборніцтва. Рыхтаваліся да яго, брат, здорава. Мобілізаваліся на падрыхтоўку, як кажуць, на ўсе сто. Учора былі комсамольскія сходы па зьменах. На іх замацавалі рапорт фабрычнай камсамоліі сёнешняму вечару. Чытаць рапорт даручылі Астаповіч. Зух баба. Ї чорт яе не бярэ. Я, брат, у жыцьці ўпяршыню такога чорта спатыкаю. Работа ў яе гарыць і сама гарыць. Зірнеш і незнарокам падумаеш аб тым, аб чым ты думаў.

А было з ёй клопатаў. Былы сакратар колектыву Клышко надуў дзяўчыну, ды кінуў. Сам пасьля таго як убачыў, што справы кепскія, кудысьці змыўся, а Каці хоць з мосту ды ў ваду. Была дзяўчына чалавекам, за работу ўзялася, спаборніцтва разгортваць пачала, а потым гоп і на бок. Прыяжджаю я гэта з Менску, толькі ў колектыў зайшоў, а да мяне сунецца нейкая трухлявая бабка. Пісульку ў рукі дае. Чытаю.

„Чунь, ты адзін толькі можаш мяне зразумець. Табе аднаму я магу даверыцца. Я цяжарная. Чуткі па фабрыцы пакуль што не пашлі, ды я іх і не баюся, толькі ня люба, ведаеш, бо будуць гаварыць не аба мне, а аб комсамолках... Сама-ж я і дзяўчына, і кабеціна, як ні кажы, а нават лепшыя сябры будуць гля-

дзець на мяне ня так, як раней, а бабы, як дазнаюцца, праходу не дадуць. Прышыюць мне назву „патаскухі“, а каб ты ведаў як гэта цяжка. Цяжка мне яшчэ і таму, што згублена першае каханьне, згублена тое, у што верыла. Не па комсамольску гэта, а так, я верыла і працавала таму, што думала жыць, але згублена надзея. Таму і цяжка мне. Я знайшла выйсьце. Я прымаю атруту. Не комсамольскае выйсьце, але інакш не магу. Аб прычыне пішу табе, бо ты самы надзейны чалавек, я сачыла за табой, за тваёй работай. Я да таго дакацілася, што, нават, пяпер у апошнюю хвіліну жыцьця, адчуваю тваю блізкасьць. Ды што я, куды я варта. Позна. Гэта прадсьмертныя мары жадаючага жыць чалавека.

Каця.

Я, Габра, прачытаў гэту пісульку. Не комсамольскі ўчынак, а ганебнае мяшчанскае выйсьце і ўсё-ж мне здалося, што зямля расступілася і я лячу, бачу, што каюк будзе, а калі, хто яго ведае. Так і лячу ні жывы, ні мёртвы. Чаму так са мной здарылася? Чаму гэта пісулька так балюча ўкалола мяне? Таму, што я сапраўды глыбока ўлопаўся ў Кацю, таму што сьмерць Астаповіч наносіла чорную пляміну на ўвесь комсамольскі колектыў, а плям гэтых у нас і так было шмат.

Як гэта часам сьмешна бывае, адчуваеш нейкую блізкасьць да чалевека, часам нават і кахаеш яго, а сказаць, не хапае адвагі, рашучасьць адсутнічае. Я некалькі раз быў дома ў Каці, амаль кожны дзень бачыў яе на фабрыцы або ў колектыве, толькі гутарыць з ёю імкнуўся больш афіцыяльна. Нават калі яна спыталася жанаты я ці халасты для таго, каб не набыць якой-небудзь падазронасьці, я адказаў, што я жанаты. І тут на табе прызнаньне, як радасна і горка бывае ў такі момант. Я нічога ня мог зрабіць. Адно, што ўзьбегла мне на памяць, гэта пазваніць дырэктару фабрыкі і сказаць, што Астаповіч на працу ня прыдзе, яна захварэла. Толькі пасьля гэтага, я рынуўся да Каці. Гаспадыня мне сказала, што Кацю павезла хуткая дапамога. Я ў амбуляторыю, а адтуль у больніцу. Каця ляжала паўмерцьвяком. Пасьля гэтага я кожны дзень хадзіў у больніцу. А праз два тыдні гаспадыня па маёй просьбе прывезла Кацю дамоў. Толькі тое, чаго баялася Каця, засталося ў больніцы. І вось ужо два месяцы, як Кацю зноў захапіў наш комсамольскі рабочы вір.

Круце ён і мяне. Сам ведаеш, вылучылі за

інструктара акругкамалу. Прыехаў я ў г. В. абсьледаваць комсамольскую работу на запалькавай фабрыцы. Узяўся за работу. Жах мяне агарнуў. Дзіву я даўся, у колектыве п'янства, ні дысцыпліны, ні парадку, ні росту комсамольскай арганізацыі, бачу патрэбны моцны кіраўнік, а яго няма. Скончыў я абсьледваньне. Павёз свае вынікі ў акругкамол, згадзіліся з маёй прапановай неадкладна абнавіць кіраўніцтва. Толькі каго пашлем, няма людзей. У гэтыя самыя дні атрымліваю я ліст. Піша Рыва. Чытаю. Вачом ня веру. Сам ведаеш мае да яе адносіны. Піонэрам быў, кахаў, комсомольцам зрабіўся, кахаў, партыйцам зрабіўся ятчэ мацней прышыбла. Здавалася і яна кахае. А тут на табе.

„Прабач Валодзя і не сярдуй. Кахаць я цябе кахаю, але што-ж адным каханьнем жыць ня будзеш. Да рэчы ведаеш адносіны маіх бацькоў да цябе.—Гой кажуць яны. Парываць з бацькамі я не магу, старыя яны, ня варта ім дасальваць. Усё гэта я пішу для таго, каб ты зразумеў, што прымусіла мяне запісацца з Гіршам (ты яго ведаеш). Ён цяпер інжынэр"...

Я ня чытаў, далей, такой брыдкай пасьля гэтага яна зрабілася ў маіх вачох і разам

тым так зрабілася цяжка, што я месца абе не знаходзіў, хацелася як найхутчэй сяго гэтага пазабыцца, часам ахоплівала жаданьне праваліцца скрозь зямлю, але работа. ў ухапіўся за яе, я сам набіўся ў акругкоме хаць на запалькавую фабрыку; маю просьбу даволілі. Я нырнуў у работу, яна вырата-ала мяне ад нутранай нуды. Я пераджыў андру... Дык вось, Габра, як бяссорамна мяне падсьцягнула гэта каханая сволач ?ыва.

Папрацаваць давялося шмат. Адно вывезла. Хлопцы дапамаглі. Цяжка было адаваць дзяўчат ад прыветных ігрышчаў, камсамолку Казлоўскую нават выключыць давялося за гэта, выключылі і Насту, бо як зайшла дзяўчына замуж, на комсамол забылася. Шмат чаго ў нас, братку, дрэннага было. Зьнішчылі. Аднаго неўдалося цалкам зьнішчыць—гэта выпівак. Ціха ціха, а потым глядзіш той ці іншы і памоча рыла. Учора мой экпраў зьявіўся на сход пад хмяльком. Відаць, прыдзецца добра хлопцу нацерці хвост.

Ну, браток, бывай. Пайду я на вечар. Неліта сьцішылася за сьцяной. Мусіць пачалі урачыстасьць.

Бел. [illegible]дзей
1934 г.

*Пішы, што ў цябе новага. Ці думаеш н*
*вучобу рушыцца? Я дык гадок, другі пачака*
*Не забудзься, Гарба, запісаць як прозьвішч*
*новага дырэктара нашай гуты.*

*Пакуль моцна цісну руку.*

*Валодзя*

Яшчэ на вуліцы Чунь пачуў знаёмы гола
а калі, адчыніўшы дзьверы, увайшоў у клю
яму рэзнуліся ў вушы бойкія Кацiны словы:

— ... Нявыкананае выканаем, дасягнутае за
мацуем.

Оркестра заіграла інтэрнацыянал.

За акном распушчала свае пахі вясна. Лёг
ветрык люба і ласкава цалаваў Чуня ў твар
Валодзя глянуў на Кацю. Радасна—задаволена
ўсьмешка лягла на яе шчаках.

---

ГПБ Ср. Рз.

Цана 40 к 805

B0000003115329